

СПЫНІЦЦА, КАБ АЗІРНУЦЦА... 6

ГРЫБНЫ ЭТЫКЕТ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 верасня 2024 г.
СЕРАДА
№ 177 (30311)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **У студзені—ліпені 2024 года знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 4,6 працэнта да $56,2 млрд.**
- Ураджайнасць бульбы ў Мінскай вобласці складае больш як 300 ц/га.



- **Мемарыяльную дошку беларускаму дзіцячаму пісьменніку Івану Сяркову адкрылі ў Гомелі.**
- За 2023 год тавараабарот паміж Беларуссю і Турцыяй склаўся на ўзроўні 107,2 працэнта да паказчыка 2022 года.
- **Беларусы перамаглі швейцарцаў на старце Суперфіналу Еўралігі па пляжным футболе.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей ЛЯХНОВІЧ, міністр транспарту і камунікацый:**

*«Плануецца, што па выніках 2024 года парк транспартных арганізацый краіны папоўняць больш як 600 аўтобусаў, 90 тралейбусаў, 22 трамваі і больш як 30 электробусаў. У гэтым годзе дзякуючы падтрымцы ўрада выходзім на 10-працэнтнае абнаўленне пасажырскага транспарту. Таксама ў краіне вялікую ўвагу ўдзяляюць пытанням лічбавізацыі транспартнай галіны. Гэты кірунак працягне развівацца».*

ISSN 1990 — 763X

24177>
9 771990 763008



Фота БелТА.

з першых вуснаў

# «НЕАБХОДНА ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ НІЧОГА НЕ ПАРУШЫЛА ЗВЫКЛЫ РЫТМ ЖЫЦЦЯ КРАІНЫ»

### Рашэнне ўнутрыпалітычных пытанняў як фундамент паспяховага правядзення палітычных кампаній

**У цэнтры ўвагі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — актуальныя ўнутрыпалітычныя пытанні і падрыхтоўка да правядзення палітычных кампаній. Гэтыя тэмы ніколі не знікаюць з поля зроку кіраўніка дзяржавы, нават калі гэтага не бачыць насельніцтва. Але ў аўторак яны сталі тэмай асобнай публічнай нарады з удзелам кіраўнікоў дзвюх палат парламента, кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта, Дзяржсакратаром Савета бяспекі, старшынямі Цэнтрвыбаркама і КДБ.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што напярэдзе шэраг падобных нарад, якія будуць звязаныя з галоўнай падзеяй будучага года — прэзідэнцкімі выбарамі. «Восень — час падводзіць вынікі, выбудоўваць стратэгію на год будучы. Самая галоўная наша задача — дастойна скончыць гэты год і пачаць наступны. Ад гэтага ў многім будуць залежаць і вынікі прэзідэнцкіх выбараў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

### З людзьмі трэба размаўляць і іх чуць

Прыярытэтам у дзейнасці ўсёй вертыкалі, кіраўнікоў цэнтральнага звяна і мясцовай улады Прэзідэнт назваў работу з людзьмі. «Мае падыходы вы ведаеце. Людзей трэба слухаць, з людзьмі трэба размаўляць. І належным чынам рэагаваць на тыя пытанні, якія яны ставяць перад намі, — сказаў ён. — Хацелася б ведаць, якія пытанні з'яўляюцца найбольш вострымі на дадзены момант». Кіраўнік дзяржавы таксама пацікавіўся, якая рэзультатыўнасць работы з такімі зваротамі. «Менавіта ад гэтага залежыць ваш аўтарытэт, аўтарытэт кожнага кіраўніка на месцах і ўлады ў цэлым, — заўважыў ён. — Зразумела, што на першы план у чалавека заўсёды выходзяць паўсядзённыя жыццёвыя клопаты. Камусьці хочацца дах адрамантаваць, камусьці плот паставіць, камусьці чагосьці не хапае ў краме і гэтак далей — усё трэба сёння вывучаць, сартаваць (гэта заўсёды трэба рабіць) і разумець, што павінны мы арганізаваць, улада, а што павінны рабіць самі людзі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што часта, напрыклад, пра цэны людзі мяркуюць не па статыстыцы, а па сваім кашальку, аб якасці адукацыі — па камунікацы з канкрэтным педагогам, аб узроўні медыцыны — па сваёй паліклініцы. А аб уладзе ў дзяржаве — па дзеяннях асобна ўзятага дзяржслужачага, да якога яны звяртаюцца. «Я намякаю на тое, што ўсе павінны ў гэтай звязцы працаваць», — падкрэсліў ён.

СТАР. 2

Грамадства

# МОЦНАЯ Ў АДЗІНСТВЕ!

### У сталіцы абмеркавалі найважнейшыя кірункі мірнага развіцця краіны




Фота Лізаветы ГОЛАД.

**У панядзелак у сталічным Палацы спорту прайшла акцыя «Беларусь адзіная». І людзей тут сабралася нямала — чатыры тысячы чалавек! Гэта студэнцкая моладзь, актывісты БРСМ, БСЖ і іншых грамадскіх аб'яднанняў, адным словам — патрыёты сваёй краіны. Перад такой масавай аўдыторыяй выступілі аўтарытэтныя лектары. Яны падкрэслілі важнасць Дня народнага адзінства, 30-годдзя інстытута Прэзідэнцтва, 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, закранулі тэму мірнага развіцця нашай краіны, а таксама адказалі на шматлікія пытанні. Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да важнай грамадска-палітычнай акцыі і даведаліся, якімі думкамі абменьваліся эксперты і аўдыторыя.**

СТАР. 4

Жывіце ў бяспецы

# НАВОДЗІЦЬ ПАРАДАК — З РОЗУМАМ

### Кожны дзень фіксуюцца дзясяткі пажараў, на якіх гінуць людзі



Фота прэс-службы МНС.

**У народзе кажуць: восень — работ восем. І гэта сапраўды так. Людзі збіраюць і апрацоўваюць вырашчаны ўраджай, спяшаюцца ў лес у грыбы, наводзяць парадак на палетках, прысядзібнай тэрыторыі і, вядома, пазбаўляюцца лішняга смецця. Аднак нярэдка, захапіўшыся сезоннымі работамі, забываюцца аб элементарных правілах бяспекі — у выніку гараць калгасныя палі (бывае, і з ураджаем), гаспадарчыя пабудовы, хаты і нават цэлыя вёскі.**

СТАР. 5

# «НЕАБХОДНА ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ НІЧОГА НЕ ПАРУШЫЛА ЗВЫКЛЫ РЫТМ ЖЫЦЦЯ КРАІНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Прэзідэнта, у цэлым работа са зваротамі грамадзян выбудавана на сістэмным узроўні. Яна максімальна даступная для любога чалавека. Ён нагадаў, што ў 2022 годзе быў праведзены вялікі семінар па актуалізацыі форм і метадаў работы з насельніцтвам. У мінулым годзе ў новай рэдакцыі выклалі Дырэктыву № 2.

«Я ведаю, што ў рэгіёнах вельмі актыўна працуюць нашы дэпутаты, прадстаўнікі Савета Рэспублікі, размаўляюць шмат з насельніцтвам і дапамагаюць людзям вырашаць канкрэтныя пытанні. У Адміністрацыі Прэзідэнта выкарыстоўваюцца новыя нестандартныя формы работы. Але трэба не забываць, што найважнейшае пытанне — гэта праца і заработная плата, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Трэба не забываць аб галоўных пытаннях, інакш усё гэта застанецца размовамі».

## «Трэба па-сапраўднаму рыхтавацца да наступнай пяцігодкі»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што будучыя прэзідэнцкія выбары скончаць фарміраванне абноўленай палітычнай сістэмы нашай дзяржавы. Многае ўжо зроблена. Самае маштабнае і значнае — канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу. Разам з мадэрнізацыяй палітычнай сістэмы нельга забываць і пра тое, што застаецца нязменным. «Выбары выбарамі, мы іх праводзілі неаднаразова і гэтыя правядзём. Нам трэба па-сапраўднаму рыхтавацца да наступнай пяцігодкі. З 2026 года пачынаецца новая», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, на наступным Усебеларускім народным сходзе трэба прадставіць людзям стратэгію на наступную пяцігодку і асноўныя напрамкі развіцця.

## Трэба вельмі ўдумліва паставіцца да даты выбараў

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння інтэрнэт і СМІ «вішчаць» кожны дзень, асабліва ў апошнія тыдні ўзнікае ажыятаж вакол даты прэзідэнцкіх выбараў. «Ці то амерыканцы, ці то нашы збеглыя ўжо прызначылі выбары, нават дату вызначылі. Развілі кучу канспіралагічных тэорый на гэты конт. Наступныя выбары Прэзідэнта, згодна з Канстытуцыяй, мы павінны правесці не пазней за 20 ліпеня. Вось крайні тэрмін, да якога мы павінны правесці выбары», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, трэба вельмі ўдумліва паставіцца да вызначэння даты дня галасавання і перыяду, на які ляжа электаральная нагрузка, паколькі прыйдзецца адцягнуць людзей, працоўныя рэсурсы.

«Неабходна зрабіць усё, каб нічога не парушыла звыклы рытм жыцця краіны. Я не кажу, што будзе лёгка. Ужо спрабуюць разгайдаць сітуацыю. Абрынуцца новыя інфармацыйныя патокі ўсялякага бруду. Мы цудоўна бачым, кантралюем усё, што адбываецца вакол нас, за межамі нашай краіны і ўнутры. Мы бачым, што там галоўнае для іх — атрымаць гранты, грошы. На ўсё ім напляваць, нават на тыя пытанні, дзеля якіх яны ўвогуле жыць павінны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У якасці прыкладу ён прывёў пытанні так званых палітзняволеных: «Ну, колькі раз сказана: у нас няма палітычных артыкулаў. І па палітычных артыкулах мы нікога не асудзілі, паколькі іх проста няма. Не, «палітзняволеныя». Добра. Дык вы змагайцеся за гэтых палітзняволеных». Прэзідэнт нагадаў, што ён асабіста два разы прымаў рашэнні па вызваленні некалькіх дзясяткаў гэтых «палітзняволеных». «Дык радаваліся б, падзякавалі б як мінімум. Не, яны заклапочаны тым, каб даказаць самім сабе і там за мяжой, што яны ўнеслі вялікі ўклад і «прымусілі дыктатара» прымаць падобныя рашэнні. Ніхто мяне, папершае, прымусіць не можа. Гэта выключана. Я часта кажу, вы мяне добра ведаеце: я ніколі па ўказцы пад ціскам не прымаў рашэнняў. Гэта былі мае рашэнні. Хтосьці захварэў, хтосьці ўжо на прагулкі хадзіць не можа (у адрозненне ад таго, як яны па праспектах блукалі). Усялякае бывае ў жыцці. Хтосьці ўжо небяспекі не нясе. Хтосьці проста адурэў, мазгі павярнуліся, і ён выйшаў, спрабаваў нешта пераварочваць на вуліцах Мінска. Усялякае ў жыцці бывала. Такіх людзей мы ўбачылі. Чаго іх там трымаць, карміць за дзяржаўны кошт? Мы іх адпусцілі, яны пад поўным кантролем праваахоўных органаў. Дык не, каб падзякаваць за тое, што мы за іх вырашылі гэтую праблему, яны не рады. Мы дакладна разумеем, што яны не рады, што гэтыя людзі выйшлі. Чаму не рады? Ім жа амерыканцы і іншыя кажуць: «А вы дзе былі, дзе ваш уклад? А ніякага. Значыць, і грошай не будзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.





Фота БелТА.

## Трэба прыйсці і растлумачыць народу

Па яго словах, чым больш людзей будзе знаходзіцца ў месцах, не такіх далёкіх, тым лепей для збеглых. Ён канстатаваў, што аб гэтым трэба казаць адкрыта. «Гэта іх праблемы і іх справы. Я проста хачу, як заўсёды, ім параіць: калі яны хочуць перавярнуць краіну і ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, даказваць сваю праваату ці яшчэ нешта — ім трэба прыходзіць і змагацца на прэзідэнцкіх выбарах. Без вуліцы, без кулямётаў, без аўтаматаў і без санкцый. Трэба прыйсці і растлумачыць, чаму вы так клапоціцеся аб Беларусі і чаму ваюеце супраць яе. Чаму вы плануеце ўзброенае ўварванне на тэрыторыю Беларусі?» — заўважыў Прэзідэнт. Ён даручыў расказаць насельніцтву, што плануюць збеглыя і якія ў іх намеры. Па словах кіраўніка дзяржавы, адпаведная інфармацыя ў спецслужбаў ёсць. «Трэба будзе растлумачыць беларусам, чаму яны такую палітыку будуюць напярэдадні Прэзідэнцкіх выбараў. І другое — грошы просяць у Дзярждэпартамента, у палякаў, у Еўрасаюзе — «дайце грошай». Ім пытанне: «Навошта?» «Мы будзем у сродках масавай інфармацыі «мачыць» Беларусь». Ім кажуць: «Вы ж ужо «мачылі», на гэта сродкаў не будзе, толькі на ўзброеныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі», — сказаў Прэзідэнт. І іранічна заўважыў: «Мы чакаем. Можаце нават не папярэджваць, адкуль вы зойдзеце і куды. Мы гэта добра ведаем. Трэба перад народам будзе стаць і растлумачыць, калі вы хочаце, каб народ вас не тое каб хоць крыху падтрымаў, а разумеў, чаго вы хочаце».

«Таму мы гатовы да ўсяго. Але трэба рыхтаваць наша грамадства, каб потым не ахалі і не вохкалі, што хтосьці кудысьці пайшоў», — паставіў задачу беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

## Усплёску зваротаў грамадзян не назіраецца

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ** у размове з журналістамі звярнуў увагу, што да палітычных кампаній яшчэ ёсць час, а сёння нельга змяншаць абароты ў рабоце над пытаннямі, якія патрабуюць вырашэння тут і цяпер. Самае важнае, на што акцэнтаваў увагу і кіраўнік дзяржавы, — работа з людзьмі і зваротамі грамадзян. Дзмітрый Крутой адзначыў, што за апошнія два гады зроблена нямала для ўдасканалення гэтай сферы: абноўлена заканадаўства, запушчана электронная платформа для звароту грамадзян. «Але мы бачым, што наша збеглая апазіцыя кожны дзень укідвае незлічоную колькасць фэйкаў, звязаную з тымі ці іншымі сферамі. Цяпер скончылася падрыхтоўка да новага навучальнага года — было маса фэйкаў, звязаных са школьнай формай, нашымі падручнікамі. Пачынаецца наступны цыкл. Але мы ставімся да гэтага спакойна. Прэзідэнт пытаўся, якія цяпер асноўныя акцэнты ў інфармацыйным парадку дня і ў кантэксце зваротаў грамадзян, што прыходзяць у Адміністрацыю Прэзідэнта, і якія тэмы найбольш хвалююць наша грамадства», — распавёў ён. Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, асаблівага ўсплёску зваротаў грамадзян не назіраецца. У некаторых рэгіёнах, напрыклад, у Гродне і ў Мінску, іх колькасць нават зменшылася. Ёсць невялікае павелічэнне ў Віцебску і Магілёве. «Традыцыйна людзей хвалююць не глабальныя палітычныя пытанні, а канкрэтныя бытавыя сацыяльныя праблемы. 30 працэнтаў зваротаў (шмат гадоў гэтая лічба не мяняецца) звязаны з жыллёва-камунальнай гаспадаркай. Вялікая доля зваротаў звязана з дарогамі, таму што людзі чуюць з экранаў, што апошнія гады ўрад значна пераразмеркаваў частку бюджэтных сродкаў на дарожнае будаўніцтва. І ўсім хочацца, каб гэтыя планы былі размеркаваны на тую мясцовасць, дзе яны жывуць», — расказаў Дзмітрый Крутой. Паводле яго слоў, нямала зваротаў грамадзян звязана з тэмай занятасці і зарплат, што таксама мусіруецца ў інтэрнэце, нібыта ў Беларусі спее эканамічная бурбалка, звязаная з апераджальным тэмпам росту зарплат. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што на гэты момант эканоміка развіваецца ў рамках сярэднетэрміновай праграмы развіцця да 2025 года. І цяпер назіраецца аднаўленне эканомікі да прагнозных параметраў. «Прэзідэнт лічыць даходы насельніцтва ключавым параметрам, як і ўзровень занятасці. Але ўзровень занятасці цяпер на гістарычна мінімальных значэннях, у нас не хапае працоўных рук у пэўных сегментах эканомікі. А пытанне даходу павінна ўвайсці ў прагнозныя параметры пяцігодкі, і мы там нічога не перавышаем, і ніякай сенсацыі там няма», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Ён звярнуў увагу, што сёння амаль усе сегменты беларускай эканомікі знаходзяцца пад тымі ці іншымі санкцыямі, тым не менш усе прагнозныя параметры выконваюцца. І гэта трэба ўлічваць пры распрацоўцы праграмы на наступную пяцігодку.

## Выбары праводзяцца ў нашай краіне, для нашага народа

«Галоўнае, што падкрэсліў Прэзідэнт, — тое, што палітычная кампанія, прэзідэнцкія выбары 2025 года — гэта завяршальны этап палітычнай мадэрнізацыі, якая была пачата ў краіне ў выніку ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю», — адзначыў **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА** ў размове з журналістамі. Ён нагадаў, што ў адпаведнасці з заканадаўствам выбары павінны прайсці не пазней за 20 ліпеня 2025 года. «Не буду хаваць, абмяркоўваюцца чатыры магчымыя даты правядзення выбараў. Для таго, каб іх агучваць, трэба правесці адпаведныя кансультацыі. Рашэнне будзе прымаць Палата прадстаўнікоў падчас свайго пасяджэння. ЦВК далажыў, што мы гатовы правесці выбары ў любую з гэтых дат. Мы ўжо падрыхтавалі адпаведныя метадычныя рэкамендацыі, падрыхтавалі інфармацыйную базу», — расказаў Ігар Карпенка. Паводле яго слоў, абмяркоўваецца пытанне запрашэння замежных назіральнікаў, дэлегацый ад міжнародных арганізацый, акрамя традыцыйных СНД і ШАС. «Ідзе планавая работа. ЦВК адкрыта для ўзаемадзеяння з усімі суб'ектамі, якія завязаны на выбарчы працэс. Гэта не толькі сістэма камісій, але і органы мясцовай улады. Гэтыя пытанні сёння таксама былі ў полі зроку кіраўніка дзяржавы», — расказаў Ігар Карпенка. Журналісты звярнулі ўвагу на ажыятаж вакол даты прэзідэнцкіх выбараў і шматлікія ўкіды ў інтэрнэт. Па словах старшыні ЦВК, тэма ўмяшання ў электаральны працэс актуальная ўсюды. «Гэтая тэма сёння актуальная, таму што, на жаль, ёсць шэраг буйных геапалітычных гульцоў, якія лічаць, што выбары трэба выкарыстоўваць у сваіх геапалітычных мэтах. Мы ж лічым дакладна і зразумела, што выбары праводзяцца ў нашай краіне, для нашага народа, для нашых нацыянальных інтарэсаў з мэтай забеспячэння суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. І мы будзем самі вызначаць, хто ў нас будзе ў парламенце, хто ў нас будзе прэзідэнтам», — адзначыў Ігар Карпенка. Ён расказаў, што тэма электаральнага суверэнітэту будзе абмяркоўвацца на кансультатыўным савеце выбарчых органаў краін СНД, дзе Беларусі будзе перададзена старшынства ў ім. «Нагадаю, што паняцце «электаральны суверэнітэт» замацавана ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. І ўсе дзяржаўныя органы, у тым ліку ЦВК, будуць працаваць на тое, каб забяспечыць электаральны суверэнітэт у будучую прэзідэнцкую кампанію», — заявіў Ігар Карпенка.

Парламенцкі дзённік

# НЕАБХОДНЫ НОВАЎВЯДЗЕННІ І ЎЗМАЦНЕННЕ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

## На парадку дня другой сесіі Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання — 16 законапраектаў

**Аб гэтым Ігар СЕРГЯЕНКА паведаміў падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў. Найперш спікер праінфармаваў членаў Савета Палаты прадстаўнікоў аб падрабязнасцях размовы з Прэзідэнтам, якая напярэдадні адбылася ў Палацы Незалежнасці.**

### Ініцыятывы па зборы інфармацыі і новыя формы работы

«Я далажыў аб асноўных выніках нашай работы за пяць месяцаў бягучага года, а таксама аб падрыхтоўцы да правядзення другой сесіі па наступных кірунках, — канкрэтызаваў спікер. — Першае — гэта падрыхтоўка да разгляду законапраектаў непасрэдна на першым пасяджэнні і ў цэлым на працягу гэтай сесіі. Сёння 16 законапраектаў — фактычна ў рознай ступені гатоўнасці, нам трэба вызначыцца, у якой паслядоўнасці іх разглядаць. Другое пытанне датычылася работы ў выбарчых акругах. Кіраўніком дзяржавы падтрыманы нашы ініцыятывы па зборы інфармацыі па актуальных праблемах, яе абагульненні, аналізе і выкарыстанні ў практычнай дзейнасці на ўсіх узроўнях: ад кіраўніка дзяржавы да мясцовых органаў улады. Гэтая работа будзе працягваецца і ў далейшым».

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, удзеліў рабоце са зваротамі грамадзян. «Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта найважнейшы кірунак дзейнасці ўсіх галін улады, у тым ліку дэпутацкага корпуса», — удакладніў Ігар Сергяенка.

Кажучы аб рабоце Палаты прадстаўнікоў на знешнім контуры, аб чым таксама ішла размова падчас даклада Аляксандру Лукашэнку, спікер адзначыў, што задачы, якія ставіць Прэзідэнт, — далей развіваць народную дыпламатыю. «Я далажыў аб рабоце, якая праведзена за гэтыя пяць месяцаў, і аб нашым узаемадзеянні на шматлікіх міжнародных пляцоўках, устанаўленні новых кантактаў, — праінфармаваў дэпутатаў спікер. — Кіраўніком дзяржавы былі падтрыманы падыходы, накіраваныя на дасягненне рэальных вынікаў. Важна браць не колькасцю (дабаўлю ад сябе — не колькасцю паездак), а напаўняць іх канкрэтным зместам».

Па словах Ігара Сергяенкі, Прэзідэнта цікавіла літаральна ўсё: як працуюць дэпутаты, дзе жывуць, якія ўмовы створаны. «Таксама кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым пытанні, як мы бачым работу дэпутата ў перспектыве, — дадаў ён. — Таму заклікаю ўсіх прысутных паразважаць над гэтай тэмай і ўнесці канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні нашай работы, па новых формах. Хацеў бы таксама звярнуць увагу ўсіх кіраўнікоў камісій — там, дзе мы яшчэ не правялі сустрэчы ў абласцях (дарэчы, гэтая форма таксама была падтрымана кіраўніком дзяржавы), іх арганізаваць».

Пры гэтым спікер дадаў, што падобныя сустрэчы не павінны поўнасцю капіраваць фармат сустрэчы ў Гродне, якая адбылася на мінулым тыдні. Ігар Сергяенка падкрэсліў, што важна выкарыстоўваць такую форму работы з насельніцтвам, каб зверыць гадзіннікі з мясцовай выканаўчай уладай. «Для таго, каб статус дэпутата яшчэ раз абазначыць перад кіраўніцтвам вобласці, гарадоў і ў далейшым знаходзіць і кропкі судакранання, і шляхі рэалізацыі па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць», — патлумачыў неабходнасць такой формы работы Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Найстройваючы дэпутацкі корпус на плённую заканадаўчую дзейнасць, спікер заклікаў самую сур'ёзную ўвагу ўдзяліць пытанням, якія датычацца сацыяльнага блока. «Найважнейшая задача сесіі — падрыхтоўка бюджэтна-падатковага пакета», — дапоўніў Ігар Сергяенка.

### Ад адукацыі да пенсіёнага забеспячэння

Як ужо раней паведамлялася, другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання пачне работу 17 верасня.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА** паведаміў у размове з журналістамі, што чатыры законапраекты, унесеныя ў парадак дня, будуць разгледжаны ў першым чытанні. «Гэта законапраекты, якія датычацца крымінальнай адказнасці, пытанняў адукацыі, крэдытаў і мікрапазык, а таксама дзяржаўнага мабілізацыйнага рэзерву, — канкрэтызаваў ён. — Шэраг законапраектаў ужо прапрацаваны і прыняты ў першым чытанні, рыхтуюцца да другога чытання. Гэта законапраекты, якія датычацца пытанняў занятасці насельніцтва, пенсіённага забеспячэння і шэрагу іншых пытанняў жыццядзейнасці беларускай дзяржавы. Традыцыйна ў блоку пытанняў, якія ўносяцца ў парадак дня, ёсць пытанні міжнароднага супрацоўніцтва. У гэтым кантэксце асаблівую цікавасць выклікаюць два законапраекты: ратыфікацыя Пагаднення з Расійскай Федэрацыяй аб арганізацыі вытворчасці двухматорнага лёгкага шматмэтавага самалёта «Асвей», а таксама «Аб пытаннях упарадкавання выкарыстання ў міжнародных адносінах электроннага лічбавага подпісу».

Кажучы аб міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса, **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ** адзначыў, што парламентарыі выконваюць патрабаванні кіраўніка дзяржавы, каб усе міжнародныя кантакты, паездкі парламентарыяў, візіты былі арыентаваны на канкрэтны вынік. «Найбліжэйшыя паездкі і візіты будуць звязаны перш за ўсё з развіццём міжпарламенцкага супрацоўніцтва, акцэнт будзе рабіцца на гандлёва-эканамічных пытаннях, — заўважыў ён. — У прыватнасці, мы плануем у рамках абмеркавання парламенцкіх тэм закранаць і канкрэтныя тэмы эканамічнага, інвестыцыйнага супрацоўніцтва, прапрацоўку пытанняў і дамоўленасцяў, якія прымаюцца на ўрадавым узроўні, і ўздел парламентарыяў у прасоўванні эканамічных інтарэсаў. Не выключаю, што ў склад парламенцкіх дэлегацый таксама будуць уключацца прадстаўнікі дзелавых колаў, якія непасрэдна займаюцца эканомікай, развіццём гандлёва-эканамічных адносін. А дэпутаты Палаты прадстаўнікоў будуць не проста суправаджаць гэтыя праекты, а аказваць непасрэдную дапамогу ў іх рэалізацыі».

**Вераніка КАНЮТА.**

З нагоды

# ГАСПАДАРЫ БЛАКІТНАГА ПОЛЫМЯ І ЧОРНАГА ЗОЛАТА

## Даведаліся, як у Мінску адзначылі прафесійнае свята нафтавікоў

**У першую нядзелю верасня наша краіна адзначыла Дзень работнікаў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці. Прафесійнае свята — выдатная магчымасць падзякаваць. Ад працы спецыялістаў гэтай сферы залежыць якасць жыцця беларусаў. Ім мы абавязаны святлом і цяплом у дамах, палівам для аўтамабіляў. Беларускіх нафтавікоў і газавікоў павіншаваў Прэзідэнт, а таксама кіраўніцтва сталіцы.**



Дзень нафтавіка, як яго скарочана называюць у народзе, вядзе сваю гісторыю з часоў СССР. І няхай у краіне няма маштабных залежаў «чорнага золата» і «блакітнага паліва», Беларусь займаецца перагонкай і перапрацоўкай сыравіны, выпрацоўваючы патрэбныя для яе эканомікі энерганосьбіты. З часоў Савецкага Саюза, на прасторах якога ў нафтавай, паліўнай і газавай сферах працавалі многія дзясяткі тысяч беларусаў, вядома: большасць радовішчаў знаходзіцца ў раёнах з цяжкімі кліматычнымі ўмовамі. І праца ў нафтагазавым комплексе прад'яўляе да чалавека павышаныя патрабаванні. Таму газавікі і нафтавікі традыцыйна карыстаюцца заслужанай павагай.

Па даных статыстыкі, больш за 70 працэнтаў нафтапрадуктаў, што выпускаюцца ў Беларусі, прама і апасродкавана экспартуецца ў 90 краін свету. Галіна забяспечвае 35 працэнтаў усёй прамысловай вытворчасці краіны і 35 працэнтаў экспарту. Больш за 25 працэнтаў паступленняў у бюджэт — адлічэнні прадпрыемстваў нафтаперапрацоўкі, нездарма яны называюцца залатой жылай краіны. Дарэчы, сёння ў газавай і паліўнай прамысловасці заняты каля 32 тысяч чалавек, яны забяспечваюць працай яшчэ больш за сотню тысяч непрофільных прафесій па-за гэтым участкам эканомікі.

Збірацца дружнай кампаніяй у гонар прафесійнага свята стала добрай традыцыяй. У Палац Рэспублікі на мінулым тыдні прыйшлі найлепшыя з найлепшых. Для іх была арганізавана канцэртная праграма, прагучала шмат слоў падзякі за ўклад у агульную справу, за неацэнную працу, дзякуючы якой прадпрыемства «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка» з'яўляецца адным з лідзіруючых прадпрыемстваў у галіне. Дарэчы, прадпрыемства тройчы занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару — у 2020, 2021 і 2023 гадах.

**Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН** павіншаваў калектыў РУП «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка», уручыў супрацоўнікам прадпрыемства падзякі і граматы Мінгарвыканкама, старшыні Мінгарвыканкама і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Сёння ў Беларусі газам забяспечаны ўсе гарады, райцэнтры і большасць вёсак. Не кожная краіна можа пахваліцца такімі паказчыкамі! Ёсць і альтэрнатыва газу — торф. Беларусь — у пяцёрцы сусветных лідараў па яго нарыхтоўцы. З торфу выпрацоўваюць паліва і сельскагаспадарчую прадукцыю. Таксама наша краіна выпрацоўвае якасны бензін, дызельнае паліва, мазут і іншыя прадукты з чорнага золата. Вядуцца і ўласныя распрацоўкі, з'яўляюцца новыя радовішчы.



Поспех прадпрыемства напрамую звязаны з прафесіяналізмам яго супрацоўнікаў, стараннем і добрасумленным стаўленнем да працы. Гэтыя важныя якасці заўсёды шануе і адзначае кіраўніцтва. Па словах **дырэктара рэспубліканскага даччынага ўнітарнага прадпрыемства «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка» Аляксандра ДРАГУНА,** сёння ў калектыве працуюць 1226 супрацоўнікаў, маецца 66 аўтазаправачных станцый, 26 газавых заправачных станцый, 58 гандлёвых залаў, 17 аўтамыек, пракат ровараў, прычэпаў і іншай тэхнікі.

Нафта і газ — ключавыя віды сыравіны для любой эканомікі, а іх здабыча і наступная перапрацоўка з'яўляецца стратэгічна важнай галіной. У газавай і паліўнай прамысловасці нашай краіны заняты тысячы чалавек. Прадпрыемствы галіны ажыццяўляюць работы па развіцці і эксплуатацыі размеркавальных газаправодаў, надзейным і бесперабойным забеспячэнні энергетычных, прамысловых, камунальна-бытавых спажыўцоў і насельніцтва прыродным і звадкаваным вуглевадароднымі газамі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# МОЦНАЯ Ў АДЗІНСТВЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




## Калектыўнае ўспрыманне інфармацыі

Пытанняў ад студэнтаў было шмат. **Студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Дзіяна ПРАХОЦКАЯ,** як і ўсе запрошаныя госці, трапіла ў Палац спорту не проста так. Яна выдатніца, актывістка БРСМ. «Мы прыйшлі з цікавасцю, хацелася б спытаць у Рыгора Юр'евіча Азаронка, які год ці перыяд у станаўленні суверэннай Беларусі ён лічыць самым значным. Асабіста для мяне самы значны 1994-ы, калі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка быў абраны Прэзідэнтам нашай краіны».

**Студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Яраслава ЛІПСКАЯ** лічыць, што такога роду мерапрыемствы вельмі важныя для прадстаўнікоў моладзі: «Цудоўна, што такія мерапрыемствы, як «Беларусь адзіная», праводзяцца не толькі ва ўстановах адукацыі, але і на такім высокім узроўні. Быць сёння госцем у Палацы спорту для нас асабліва ганарова. Мы жывём у прыгожай, мірнай, спакойнай краіне, і вельмі хочацца, каб гэта захоўвалася заўсёды, без розных канфліктаў і войнаў», — сказала яна.

Наступны наш суразмоўца — **курсант Мінскага сувораўскага вучылішча Раман МАСЛОЎСКІ.** Малады чалавек падзяліўся з журналістамі тым, што для яго значыць такая сустрэча: «Гэта ўнікальная магчымасць задаць пытанні спікерам, журналістам, прадстаўнікам улады. Для моладзі ў цэлым гэта добрая магчымасць пагаварыць



пра перспектывы развіцця краіны. Мяне, напрыклад, у першую чаргу цікавяць перспектывы развіцця Узброеных Сіл, бо я з'яўляюся прадстаўніком Мінскага сувораўскага вучылішча, а таксама развіцця сістэмы адукацыі. Хацелася б, каб на базе нашай установы з'явіліся новыя аб'яднанні па інтарэсах, розныя секцыі. Асабліва цікавяць беспілотныя лятальныя апараты, хацелася б займацца з імі часцей».

**Студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандра КАЗЛОВА** прыйшла ў Палац спорту па каштоўныя парады і новыя веды. Дзяўчыну хвалюе сітуацыя, якая складваецца на межах нашай краіны: «Мне, як прадстаўніку моладзі, вельмі цікава паслухаць сённяшніх спікераў, даведацца, што яны думаюць пра сітуацыю ў свеце, паслухаць і атрымаць каштоўную параду, якая паспрыяе росквіту нашай краіны. Мне прыемна бачыць сваіх аднагодкаў, у якіх такія ж інтарэсы».

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА:** «Няпроста працаваць са шматлікай аўдыторыяй, але спікеры ў нас — вельмі вопытныя прафесіяналы. Большая частка залы — моладзь. Гэта прынцыпова важны момант, таму што, паверце, калектыўнае ўспрыманне інфармацыі, якая датычыцца, у першую чаргу, арыенціраў для будучага развіцця нашай краіны, абсалютна асаблівае. На сцэне прадстаўлены гісторыкі, журналісты — палітолагі і эксперты. Калі гэты досвед атрымаецца і мы ўбачым вынік, няма сумневу, што «Беларусь адзіная» стане рэгулярным, а не сезонным праектам. Моладзь сёння досыць адукаваная. Паверце, яны вельмі многае бачаць і чуюць. Тут жа мы аб'яднаем усё».

## Пра прэзідэнцтва, паноў і адзінства

**Тэлевядучы і журналіст Рыгор АЗАРОНАК** падчас свайго выступлення падкрэсліў важнасць і значнасць інстытута прэзідэнцтва, распавёў прысутным пра тое, што гэта такое: «Што такое 30-годдзе прэзідэнцтва? Я на год маладзейшы за прэзідэнцтва, нарадзіўся ў 1995 годзе. І за ўсё сваё жыццё ні разу не сутыкнуўся ні з якімі бандытамі, ні з якімі крымінальнікамі. Успомніце мітынг 16 жніўня 2020 года ў Мінску. Прэзідэнт распавёў, чаго гэта каштавала. «Мы іх квасілі на дарогах», — сказаў тады ён. І кожны з вас сёння можа гуляць па вуліцах бяспечна і спакойна. Не было ніводнага дня, каб хтосьці з вас вымушана не змог паесці, а такіх людзей у свеце мільярд! У гэтым гідкім, несправядлівым амерыканскім свеце, дзе кожны чацвёрты амерыканец пакутуе на атлусценне, а мільярд людзей галадае!!!»

Рыгор Азаронак адзначыў, што ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы для мірнага росквіту: «Мы маем сваю энергетыку, атамную станцыю. Мы маем выдатныя гарады, хутка будзем узводзіць новыя парты. У нас будуць і ў Мурманску, і на Кольскім паўвостраве, а ў іх усё загнулася: і чыгунка, і парты — абсалютнае беспрацоўе! Вось гэта, што называецца, «палітыкі страляюць сабе ў ногі» і не толькі. Таму што яны несамастойныя!»

Журналіст і тэлевядучы прывёў цікавы факт: «Ёсць трагічны прыклад Украіны. Да гарызонту магілкі ў Львове! Вось такія маладыя людзі, як вы, іх сёння хапаюць і адпраўляюць на мяса, на забой! Дзеля маразматычнага дзеда ў Амерыцы, дзеля фінансавых капіталаў, але ніяк не дзеля ўкраінцаў! Лукашэнка адвёў ад нас гэту бяду! Усё гэта — 30-годдзе прэзідэнцтва, і я ўпэўнены, што так будзе і далей. Мы будзем адзіныя і абавязкова пераможам!»

Дата правядзення Дня народнага адзінства выбрана невыпадкова. 17 верасня 1939 года пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Сёння гэты дзень — напамін пра самадастатковасць і сілу беларусаў у адзінстве. «Над намі не стала пана! Вельмі важна: пана як гаспадара! Беларусы сталі на ўсёй сваёй тэрыторыі самастойна кіраваць, самі кіраваць! Колькі ў свеце народаў? Сотні, можа, тысячы. Колькі ў свеце дзяржаў? Дзве сотні. А колькі самастойных з іх? Дзясятак! Рэальна дзясятак, і мы ў іх ліку. І, калі Прэзідэнт, выступаючы ў Віцебску, звяртаючыся да вас, беларусаў, звяртаючыся да студэнтаў сказаў: «Вы вялікія! Вялікі народ беларусы!» — гэта вельмі да многага абавязвае!»



Рыгор Юр'евіч адзначыў, што наша краіна сапраўды моцная і незалежная: «Мы выбіраем свой урад. Не тэлефануюць з амерыканскага пасольства, як у іншых краінах, і кажуць: «Гэтага змяніце, гэтага прыбярыце». Не кажуць, як на гэтых выхадных сенатар Ліндсі Грэм, стоячы побач з Зяленскім, сказаў: «О! Good! Малайчына, boy! Вы там вельмі добра ваюеце за зямлю, на якой вельмі шмат мінеральных угнаенняў, і за тое, каб мы потым, амерыканцы, не ваявалі з рускімі». А ўкраінцаў хтосьці спытаў? А ў палякаў сёння нехта пытаецца, ці хочуць яны гэтай мілітарызацыі, гэтай вайны. І мы сёння пытаем: «Паны-браты-палякі, вы хочаце гэтай крыві, гэтай вайны, гэтых забойстваў?» Мы не хочам, але сваю зямлю не аддадзім, як і ў 1939 годзе. Мы выбіраем свой лёс. І гэтае маладое свята, якое з'явілася пасля 2020 года, калі нам казалі: «Не трэба яго святкаваць! Давайце нікога крыўдзіць не будзем. Давайце вось усё ціха, мірна і ўсё...» Мы будзем яго святкаваць! У кожнага народа ёсць дзень свайго аб'яднання, і, паглядзіце, гэтыя збеглыя за мяжой яго не святкуюць. Яны кажуць, што гэта не свята, што гэта ўсё «фуфло». Значыць, для іх Ваўкавыск, Гродна, Ліда — гэта не беларускія гарады, яны гэта прызнаюць. А мы кажам: «Не, яны беларускія, заўсёды будуць беларускімі, і мы заўсёды будзем разам!»

## За што ідзе галоўная барацьба?

Самая галоўная геапалітычная барацьба ў свеце ідзе за розумы. Пра гэта заявіў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, старшыня «Беларускага таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН:** «У пятніцу быў у кіраўніка дзяржавы з групай нашых гісторыкаў. І мы гаварылі пра гістарычны музей. Шчыра, нікога не хачу пакрыўдзіць, я не згадваю іншага такога прыкладу, каб канцэпцыю гістарычнага музея абмяркоўвалі на самым высокім узроўні. Можа, гэта ўласціва нам, беларусам, таму што мне ўспамінаецца, як у 1946 годзе ў яшчэ спустошанай Беларусі бюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі на чале з Панамарэнкам разглядала падручнік гісторыі БССР. І мне было вельмі прыемна, што наш Прэзідэнт асабіста ўдзяляе гэтаму вялікую ўвагу».



Па яго словах, самая галоўная барацьба ідзе за душы, за розумы, за гістарычную памяць. Яна вызначаецца гісторыяй. Калі разваліўся СССР, першае, што сталі рабіць, — лезці ў падручнікі гісторыі, мяняць музейныя экспанаты. Аднымі з першых, хто зайшоў у Беларусь, быў Сорас і яго каманда. Яны сказалі: памяняйце падручнікі гісторыі. І першы, каго выгнаў з Беларусі Аляксандр Лукашэнка, — гэта быў Сорас.

«Прэзідэнт нас арыентуе, што ўсе пытанні патрабуюць грамадскага абмеркавання і, калі заўгодна, палемікі. Ідэалогія, інфармацыйная работа, палітычнае будаўніцтва, пытанні адукацыі і навукі — усё ў нашай краіне падвяргаецца грамадскаму абмеркаванню, у гэтым сіла нашай мадэлі. Зваротная сувязь улады і грамадзян, падобныя пляцоўкі дазваляюць нам адкрыта пагаварыць пра тое, што дасягнута і, самае галоўнае, куды рухацца далей. Нашы лектары па ўсёй краіне падтрымліваюць прамы кантакт з аўдыторыяй, імкнуцца не толькі данесці сваю пазіцыю, але і пачуць людзей, а гэта — самае галоўнае. Важна і тое, якія пытанні нам задаюць, што людзей хвалюе, што выклікае водгук. Па меры магчымасці мы імкнёмся адказаць на гэтыя пытанні, але ў любым выпадку, абагульняючы ўвесь парадак «Беларусі адзінай», мы дакладваем яго кіраўніцтву краіны, маем зносіны з мясцовымі ўладамі, бачым тыя кірункі, па якіх неабходна ўзмацніцца. Некаторыя ідэі падказваюць самі людзі, таму што на месцах часта лепш відаць. А сёння, калі мы сабраліся ў Палацы спорту, у нашай сталіцы, якраз і хочам адкрыта абмяняцца думкамі па бягучай сітуацыі і тым, з якімі ідэямі і пасыламі ўступаем у новы, вельмі адказны палітычны сезон».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# НАВОДЗІЦЬ ПАРАДАК — З РОЗУМАМ

## СПАЛІЛІ СМЕЦЦЕ — АТРЫМАЛІ АПЁКІ

Падчас навядзення парадку на зямлі церпяць і людзі. Пры гэтым атрымліваюць такія апёкі, што без дапамогі медыкаў не абысціся. Напрыклад, 18 жніўня ратавальнікам стала вядома аб шпіталізацыі мужчыны з апёкамі 38 % цела. Выпадак, які прывёў да такога стану, здарыўся ў аграгарадку Лашаны Мінскага раёна. Як высветлілася, мужчына распальваў вогнішча, выкарыстоўваючы для гэтых мэт бензін. У ходзе правядзення работ адбылася ўспышка пары лёгкаўзгаральнай вадкасці, у выніку чаго ён атрымаў апёкі. Пацярпелы самастойна звярнуўся ў бальніцу. Падраздзяленні МНС не прыцягваліся.

Яшчэ адзін няшчасны выпадак здарыўся ў Барысаве. Мужчына, знаходзячыся на тэрыторыі прыватнага домаўладання, спальваў сухую расліннасць. У выніку асабістай неасцярожнасці атрымаў апёкі твара.

І гэта не адзінкавыя выпадкі, як можа падацца. Узгаранні на прысядзібных тэрыторыях фіксуюцца штодзённа ва ўсіх рэгіёнах краіны. Напрыклад, толькі за адны суткі — з 31 жніўня на 1 верасня — супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выязджалі на тушэнне 45 пажараў у экасістэмах. З іх — сем лясных пажараў, тарфяны пажар і 37 пажараў травы і кустоў. 21 паведамленне аб узгараннях у прыродных экасістэмах паступіла з Гомельскай вобласці. Там жа ад выпальвання сухой расліннасці пацярпелі два чалавекі.

Адзін з іх паліў смецце на тэрыторыі прыватнага домаўладання ў вёсцы Слінкі Петрыкаўскага раёна. Мужчына дапамагаў сябру наводзіць парадак на прысядзібным участку. Яны спальвалі смецце, ад якога пачала гарэць сухая расліннасць. Абодва таварышы прыступілі да самастойнага тушэння пажару і згубілі адзін аднаго. У нейкі момант уладальнік участка пачуў крыкі аб дапамозе і пабег да сябра. Мужчына знайшоў таварыша на зямлі, на ім гарэла адзенне. Неадкладна была выклікана хуткая дапамога. У цяжкім стане — з атручэннем прадуктамі гарэння і апёкамі — пацярпелага даставілі ў бальніцу. У выніку пажару была знішчана сухая расліннасць на плошчы 0,3 га. Падраздзяленні МНС не прыцягваліся.



А вось у іншым выпадку без ратавальнікаў не абышлося. Паведамленне аб гарэнні сухой расліннасці на прыватным падворку ў вёсцы Галубоўка Брагінскага раёна паступіла ў МНС ад работнікаў лясгаса. Пажар выявілі дзякуючы камерам, устаноўленым для маніторынгу сітуацыі ў лясным масіве. Супрацоўнік лясгаса, які пражывае ў дадзеным населеным пункце, знайшоў на падпаленым участку пенсіянера, які самастойна спрабаваў справіцца з агнём, аднак наглытаўся дыму. Пасля агляду медыкаў пацярпелага жыхара вёскі з атручэннем прадуктамі гарэння даставілі ў бальніцу. Агонь ліквідавалі ратавальнікі. У выніку пажару знішчана сухая расліннасць на плошчы 0,5 га. У абодвух выпадках прычынай пажараў стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры выпальванні сухой расліннасці.

## ТРАГІЧНАЯ НЕАСЦЯРОЖНАСЦЬ

На выхадных у аграгарадку Лахаўка Лунінецкага раёна на суседніх участках гарэлі два гаспадарчыя будынкі. У адным з іх агонь знішчыў дах і маёмасць, пашкодзіў сцены і перакрыцце, у другім знішчыў дах, пашкодзіў сцены і маёмасць. Меркаваная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры спальванні смецця гаспадаром аднаго з участкаў.

«Пагаспадарыў» агонь і ў вёсцы Худлін Кобрынскага раёна: там загарэліся сухая трава, лясны масіў і будынак, які не эксплуатуецца. Паводле меркавання ратавальнікаў, да здарэння прывяла чалавечая халатнасць і неасцярожнае абыходжанне з агнём. Як і на станцыі Дзятлавічы ў Лунінецкім раёне, дзе згарэлі гаспадарчы будынак і нежылы дом, а таксама на хутары Знаменка ў Брэсцкім раёне: тут вогненная стыхія знішчыла гаспадарчую пабудову.

Спецыялісты разбіраюцца і ў прычыне трагедыі, якая адбылася ў аграгарадку Сакалова Бярозаўскага раёна. За прыватным падворкам у полі гарэла сухая расліннасць, якую мясцовыя жыхары патушылі да прыбыцця падраздзяленняў МНС. У траве ратавальнікі знайшлі загінулага мужчыну-пенсіянера.

Трагічна скончылася навядзенне парадку на зямлі і ў Ганцавіцкім раёне. Пажар здарыўся на тэрыторыі прысядзібнага ўчастка ў вёсцы Мельнікі. Агонь паспеў перакінуцца на гаспадарчы будынак на суседнім участку. У траве з апёкамі ратавальнікі знайшлі пенсіянерку, якая самастойна спрабавала справіцца з вогненнай стыхіяй.





Брыгада хуткай дапамогі забрала сяльчанку ў бальніцу, дзе пазней яна памерла. Прычына пажару высвятляецца. Адна з галоўных версій — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры выпальванні сухой расліннасці.

## КАНТРОЛЬ ЗА ПРАЦЭСАМ

Ратавальнікі нагадваюць: выкарыстанне адкрытага агню пры навядзенні парадку на зямлі ў некалькі разоў павышае рызыку пазбавіцца маёмасці, нанесці шкоду навакольнаму асяроддзю і атрымаць апёкі. У пажаранебяспечны перыяд таксама не выкарыстоўвайце адкрыты агонь у лясах і на тарфяніках, не кідайце недакуркі, запалкі, асколкі шкла, а таксама не выкарыстоўвайце агонь для навядзення парадку на прысядзібных участках. Гэта можа прывесці да трагедыі: ад травы, якая гарыць, успыхваюць жылыя дамы. Акрамя таго, агонь пераходзіць на лясныя масівы і можа прыняць пагрозлівыя памеры, пераходзячы ў тарфяныя і лясныя пажары. Пры гэтым важна сачыць за забаронамі на наведванне лясоў.

«Месцы для развядзення вогнішчаў павінны быць ачышчаны ад гаручых рэчываў і матэрыялаў, сухой расліннасці і забяспечаны сродкамі тушэння, — нагадвае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ** і ўдакладняе: — Гэта можа быць вядро з вадой або вогнетушыцель, рыдлёўка — тое што дазволіць вам у выпадку няштатнай сітуацыі прадухіліць распаўсюджванне агню. Месца вогнішча размясціце ўдалечыні ад хаты, гаспадарчых пабудоў, каб выключыць іх загаранне. Для распальвання ні ў якім разе не выкарыстоўвайце лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці. Не падвяргайце сваё здароўе небяспецы».

Падчас навядзення парадку з выкарыстаннем агню ратавальнікі рэкамендуюць не забываць аб тым, што неабходна пастаянна кантраляваць працэс. «І самае галоўнае: пасля дагарання вогнішча не забудзьцеся праліць вуголле вадой, каб выключыць магчымасць паўторнага ўзгарання, — звяртае ўвагу Анастасія Швайбовіч. — Часам дастаткова адной іскры, каб ваша жыццё і маёмасць былі пад пагрозай».

Калі на вуліцы ветранае надвор'е, працэс спальвання лепш перанесці на іншы дзень. Не варта забываць і аб тым, што выпальванне сухой расліннасці, траў, а таксама ржышча і пажніўных рэштак на палях забаронена! Смецце павінна вывозіцца і ўтылізавацца дазволенымі спосабамі. У іншым выпадку прадугледжаны штрафныя санкцыі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МНС.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Паўднёвай Карэі ўрачы-пратэстоўцы апублікавалі «чорны спіс» калег

Паўднёвакарэйскія ўрачы-інтэрны, якія пратэстуюць супраць павелічэння квоты ў медыцынскіх ВНУ, апублікавалі асабістыя даныя калег, хто працягвае лячыць пацыентаў на фоне крызіснай сітуацыі ў аддзяленнях неадкладнай дапамогі. Аб гэтым заявілі ў Міністэрстве аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння Рэспублікі Карэя, паведаміла ТАСС. «Гэта падрывае волю і дух медыцынскага персаналу», — адзначыў начальнік дэпартамента палітыкі ў сферы аховы здароўя міністэрства Чон Юн Сун. Як паведаміла агенцтва «Рэнхап», прэм'ер-міністр Рэспублікі Карэя Хан Док Су заявіў, што ў пракуратуру перададзены імёны 30 чалавек, дзеянні якіх будуць праверany на адпаведнасць закону. Як вядома, з 20 лютага каля 90 працэнтаў прыкладна з 13 тысяч інтэрнаў і ардынатараў не выходзяць на работу з-за рашэння ўрада павялічыць квоты ў медыцынскіх ВНУ.

### Аналітыкі падлічылі, калі з'явяцца трыльянеры

Капітал заснавальніка Tesla амерыканскага бізнесмена Ілана Маска можа дасягнуць трыльёна долараў да 2027 года. Гэта падлічылі спецыялісты, якія аналізуюць даходы. Група Informa Connect Academy зыходзіла ў сваіх разліках з таго, што капітал Маска штогод павялічваецца ў сярэднім на 110 працэнтаў. Згодна з індэксам мільярдэраў Bloomberg, ён ужо з'яўляецца самым заможным чалавекам планеты з $251 млрд. Як вынікае з аналізу Informa Connect Academy, заснавальнік бізнес-канглામерату Гаўтам Адані (Індыя) стане другім у свеце трыльянерам. Гэта можа адбыцца ў 2028 годзе. Яго капітал у сярэднім расце на 123 працэнты за год. Таксама ў 2028-м трыльёна могуць дасягнуць капіталы галоўнага выканаўчага дырэктара Nvidia Джэнсена Хуанга і інданезійскага магната Праджога Пангесту.

### Узровень беспрацоўя ў Канадзе ўзрос да 6,6 працэнта

Узровень беспрацоўя ў Канадзе вырас на 0,2 працэнтных пункта да 6,6 працэнта ў жніўні пасля захавання стабільнага ўзроўню ў ліпені. Аб гэтым паведаміла «Сіньхуа» са спасылкай на Статыстычнае ўпраўленне Канады. Узровень беспрацоўя ў жніўні стаў найвышэйшым з мая 2017 года, за выключэннем «пандэмічных» 2020 і 2021 гадоў, паведаміла ўпраўленне. Узровень беспрацоўя ў цэлым захоўвае тэндэнцыю да росту з красавіка мінулага года, павялічыўшыся за гэты перыяд на 1,5 працэнтнага пункта. У жніўні налічвалася 1,5 мільёна беспрацоўных, што на 60 тысяч чалавек (4,3 працэнта) больш, чым у ліпені, і на 272 тысячы чалавек (22,9 працэнта) больш, чым год таму. Паводле звестак упраўлення, сярод тых, хто быў беспрацоўным у ліпені, 16,7 працэнта знайшлі работу ў жніўні, што ніжэй за адпаведны паказчык гадам раней. Гэта сведчыць аб тым, што беспрацоўныя могуць сутыкнуцца з вялікімі цяжкасцямі пры пошуку работы.

З людзьмі і сам-насам

# СПЫНІЦЦА, КАБ АЗІРНУЦЦА...

## На родную вёску, цану Перамогі і вызвалення, на ўсё, што «некалі было»

**...З тым, як хутка канчаецца лета, можа паспаборнічаць хіба зарплата.**
**І сапраўды, толькі ўчора, здаецца, садзілі на сваіх агародах бульбу, моркву, агуркі, памідоры, капусту (і — здаралася — сваё ўласнае здароўе), а ўжо час збіраць ураджай і, вядома ж, дзяліцца.**
**У вёсках, ля шумных дарог — вёдры з яблыкамі і бульбай, пакеты з памідорамі, горкі бурачкоў і кабачкоў. Месцамі — што называецца — у агульным доступе, без ніякай «аховы». То-бок, праязджаючы міма, ты разумееш, што гэта ўсё прадаецца: спынішся, захочаш купіць, — і, напэўна ж, з'явіцца прадавец...**
**Неяк раз мы даўгавата яго чакалі (вельмі прыгожая была антонаўка!), спыталі цану. Сказаў: «Ды так бярыце». — «Па парачцы яблыкаў? — удакладнілі. — Ці вядро?» — «Не, вядро пакіньце, — загадаў «прадавец». — Я ў ім новых яблыкаў на дарогу вынесу».**
**Вось такі ў чалавека «бізнес». Як казаў адзін аўцюковец: «Абыдуся я без вашых грошай... А вы, калі хочаце аддзячыць, лепш пажадайце здароўя — і маім дзецям, і мне».**
**Іншымі словамі, рабі дабро. Раней ці пазней яно вернецца. Пра тое ж у лістах чытачоў (па традыцыі: у кароткім пераказе).**

*Некалі і, на жаль, даўно, адпраўляючы нас у школу, бацькі прасілі, каб мы хаця стараліся, каб вучыліся, каб змаглі пасля «зачапіцца ў горадзе». У вёсцы ні заробкаў, ні перспектыў тады не было,* — піша **Марыя Клімковіч з Мінска.** — *Мы выканалі гэты бацькоўскі наказ: усе трое атрымалі спецыяльнасці, работу, стварылі сем'і, як ні цяжка было, набылі, пабудавалі асобнае жыллё... У вёску да бацькоў прыязджалі часта: яны, чым маглі, усё жыццё дапамагалі нам, мы — ім.*

*Цяпер дапамога ўжо не патрэбна — прыязджаем хіба да іх на магілы. І пры гэтым заўсёды пакідаем час, каб прайсціся па вёсцы, праведаць знаёмых, паглядзець, што змянілася. Радуюць там новыя дыхтоўныя дамы (у асноўным — так званых дачнікаў), прафесійнае, дызайнерскае афармленне прысядзібных участкаў, кветкі, парадак, чысціня, жывыя агароджы. І не могуць не засмучаць «нежывыя»: з бетону, з металапрофілю, прычым не толькі ад вуліцы, па ўсім перыметры.*

*...Ніколі не разумела, — піша чытачка, — навошта яны. Што гаспадары за імі хаваюць? А галоўнае — што бачаць самі? Свой дом і ўчастак? Усё іншае ім «па барабане»?*

*Але ж людзі — а тым болей у вёсках — ніколі так не жылі. Стараліся — выразалі або замаўлялі прыгожыя аканіцы, шалявалі і фарбавалі сцены, садзілі кветкі, пад шнурочак (каб роўненька) разбівалі грады. І рабілі ўсё гэта, што называецца, адзін перад адным, не толькі для сябе — для ўсіх. Ад людскіх вачэй (што было — было) хавалася хіба тое, што... укралі. Не хацелася б верыць, што новыя дамы з такіх матэрыялаў, што іх гаспадары — ліхадзеі. І ў той жа час не хацелася б хадзіць па вясковых вуліцах, як кратам — па цёмных тунэлях...*

*...Ведаю,* — працягвае спадарыня Марыя, — *што няма закона, які абмяжоўваў бы аматараў будаваць дамы-крэпасці. Але ж той самы старшыня сельсавета, як мне здаецца, мог бы падысці да будучых наваселаў, пагутарыць, сказаць, што новы дом грэх хаваць ад людзей. Раптам чалавек паслухаў бы?»*

Слова — а тым больш разумнае — гэта сапраўды сіла.

І голас — таксама.

*Плакат «Родина-мать зовёт!», песня «Вставай, страна огромная...», голас Левітана... Па сіле ўздзеяння іх ставілі побач,* — піша **спадарыня Тамара Круталевіч з Беразіно.** — *За галаву савецкага дыктара Гітлер аб'явіў прэмію ў 250 тыс. рэйхсмарак, у СС стварылі спецпадраздзяленне па яго ліквідацыі. Аднак у немцаў не было ніводнага фотаздымка радыёвядучага.*

*Знешнасць хлопца ў свой час не ўразіла і прыёмную камісію маскоўскага кінатэхнікума — Юрый туды не паступіў. Але ж праўду кажуць: калі адны дзверы зачыняюцца, то павінны адчыняцца другія. Хлопец, чый голас быў візітоўкай яшчэ ў школе (не толькі з-за гучнасці, а, найперш, з-за прыгажосці тэмбру) прачытаў аб'яву аб наборы ў школу дыктараў...*

*На радыё Юрый пачынаў стажорам, а калі ўпершыню выйшаў у эфір, голас пачаткоўца пачуў Сталін і загадаў, каб яго даклад да чарговага з'езда ВКП (б) зачытаў менавіта гэты малады чалавек.*

*За пяць гадзін чытання (менавіта столькі заняў даклад) Юрый ні разу не збіўся і ў 19 стаў, можна сказаць, галоўным дыктарам Саюза.*

*У чэрвені 1941-га Левітан зачытаў паведамленне аб пачатку вайны. У жніўні, калі немцы набліжаліся да сталіцы, Левітана эвакуіравалі ў Свярдлоўск, куды перавезлі і каштоўнасці Эрмітажа. У гэты час Гітлер ужо рыхтаваўся да параду на Краснай Плошчы і хацеў, каб паведамленне аб падзенні Масквы зачытаў менавіта Левітан. Узнагароду за яго галаву павялічылі (пры ўмове, што дыктара возьмуць жывым).*

*Але фантазіям фюрара не лёс быў спраўдзіцца: ненавісны яму голас працягваў гучаць у эфіры (сакрэтную радыёстудыю абсталявалі ў падвале аднаго са свярдлоўскіх дамоў)...*

*У Маскву Левітан вярнуўся толькі ў 1943-м. У маі 45-га, паведамляючы аб Перамозе, ён ледзьве стрымліваў слёзы: вельмі хацеў дадаць ад сябе: «С Победой, братцы!». І зрабіў гэта, але ж пасля таго, як выключылі мікрафон.*

*...Усе тэксты,* — адзначае ў лісце шаноўная чытачка, — *Левітан чытаў, прапускаючы праз сэрца.*

*Біцца яно перастала ў жніўні 1983-га, у час сустрэчы з ветэранамі сяла Бяссонаўка, дзе ў гады вайны грымелі бai Курскай бітвы і загінуў кожны пяты салдат Чырвонай Арміі.*

Людзі сыходзяць. Справы іх застаюцца: адзначаючы 80-годдзе вызвалення Беларусі, грэх і сапраўды не згадаць голас перамогі — голас Левітана.

А яшчэ — апроч спраў — застаюцца дзеці.

*Сям'я майго таты Пятра Андрэевіча Балыша з вёскі Суцькава, што на Смаргоншчыне, была малазямельнай, але багатай на дзяцей: у ёй гадаваліся дзве дзяўчыны і чацвёрка хлопцаў. Адзін з іх, мой будучы тата,* — піша **спадар Мікалай Балыш з Ашмян,** — *у 13 гадоў на выдатна скончыў царкоўна-прыходскую школу, і яго адразу прызначылі настаўнікам. Праўда, на гэтай пасадзе ён пратрымаўся ўсяго два дні. Сярод вучняў, як расказваў, аказаліся дзеці (а галоўнае — дзяўчаты), старэйшыя за яго. Яны не тое пастрашылі, не тое пасмяяліся з маладога настаўніка, і ён папросту ўцёк.*

*Сядзець дома без работы, вядома ж, не мог. Старэйшая сястра Фёкла, якая жыла і працавала ў Петраградзе, падшукала яму багатую сям'ю. Хлопец стаў разносіць і прадаваць дамашнюю выпечку, дапамагаць па гаспадарцы.*

*У 16 гадоў яго ўзялі вучнем слесара на Пуцілаўскі завод, дзе ўжо дзейнічала моцная нелегальная рэвалюцыйная арганізацыя. Тата стаў хадзіць на сходкі, разам з калектывам рабочых-пуцілаўцаў сустракаў Леніна на Фінляндскім вакзале.*

*Пасля рэвалюцыі вярнуўся на Бацькаўшчыну, дзе жылося ніколькі не лепей. Да таго ж пазней — пры новай, польскай уладзе. Па ўспамінах бацькі, людзі як маглі супраціўляліся апалячванню, у вёсках арганізоўваліся суполкі Кампартыі Заходняй Беларусі. У складзе суцькаўскай былі браты Пётр і Павел Балышы, Уладзімір Новік з вёскі Наваспаск. Камуністы распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, тата з братам — выдатныя цесляры — у розных вёсках будавалі хаты і праводзілі адпаведныя гутаркі з сялянамі.*

*Па даносе правакатара ў студзені 1927 года іх арыштавалі, абвінавацілі ў падрыхтоўцы ўзброенага паўстання і кінулі ў турму. Допыты цягнуліся амаль год, суд — толькі тры дні — і быў добра апісаны ў польскай газеце «Трыбуна люду». Дзякуючы гэтай публікацыі ў працоўны стаж майго бацькі былі залічаны тры гады турэмнага зняволення.*

*...Два мае дзядзькі,* — піша **спадар Мікалай Балыш,** — *загінулі на вайне. Тата пасля вызвалення Смаргоншчыны будаваў хаты ў навакольных вёсках і розныя аб'екты ў Мінску, рамантаваў вагоны на чыгуначным вузле ў Маладзечне. Я ганаруся тым, што яны зрабілі свой унёсак у барацьбу за вызваленне Заходняй Беларусі, у Перамогу.*

...Лета і сапраўды як маленькае жыццё, а жнівень—верасень — як час, каб спыніцца і азірнуцца на ўсё перажытае.

*Тамара Рыгораўна Белязяк — асоба ў нашым раёне добра вядомая. За спінай у яе — больш як 80 гадоў жыцця, насычанага бязліччу цікавых падзей,* — піша **Ніна Бурко з Бярэзіншчыны.** — *Неяк раз я папрасіла жанчыну ўспомніць самыя-самыя і вельмі здзівілася, што сярод іх — злёт маладых будаўнікоў камунізму. «Ні да гэтага мерапрыемства, — прызнавалася Тамара Рыгораўна, — ні пасля яго я не бачыла такой прыгажосці, не адчувала такой эйфарыі. Людзей у сталічным Палацы прафсаюзаў было проста мора! Усе такія радасныя, шчаслівыя, усе аднадумцы... Мы ж верылі, што камунізму — быць! На памяць ведалі кодэкс яго будаўнікоў. Цяпер гэты дакумент знойдзеш хіба недзе ў музеі ці ў інтэрнэце. А можа, і дарэмна? Хіба можна адмаўляць такую норму паводзін, як праўдзівасць, маральная чысціня, сціпласць, клопаты пра дзяцей і бацькоў?»*

*Тамара Белезяк, тады студэнтка сельгастэхнікума і дэлегатка злёту, была ўвасабленнем гэтых норм і правілаў.*

*Пасля вучобы працавала сакратаром Пагосцкага пассавета, прымала ўдзел у стварэнні камсамольскіх арганізацый, у правядзенні розных мерапрыемстваў.*



*У тым жа калгасе «Бярэзінскі» было шмат моладзі і не было ніякага месца для агульнага адпачынку. Давялося ўгаварыць старшыню калгаса аддаць пад клуб збожжасклад. Атрымаўшы дазвол, моладзь літаральна за месяц прывяла памяшканне ў належны стан...*

*І гэта, вядома ж, не адзінкавы прыклад: арганізацыя маладзёжных фестываляў і сацыялістычнага спаборніцтва, конкурсы мастацкай самадзейнасці і мноства іншых мерапрыемстваў — усё гэта было клопатам сакратара райкама камсамола Тамары Белязяк. Ёй — прыгожай, абаяльнай, адказнай — рады былі ўсюды і ўсе, а ўжо кавалеры...*

*З выбарам дзяўчына не спяшалася, нібы чакала свайго адзінага — Сяргея Паўлавіча Яскевіча. Разам яны абжываліся, гадавалі дзяцей, працавалі на карысць краіны і людзей.*

*Цяпер Тамара Рыгораўна, на жаль, адна — без сваёй палавіны. Але ж трымаецца: з часам, дасць бог, зацягнецца трохі рана, і жыхары горада зноў убачаць яе на розных мерапрыемствах, моладзь пачуе ўспаміны пра наша камсамольскае мінулае. Як пісаў паэт:*

*Усё ў жыцці мінае, зменна —*
*Прайшло. Мінула. Адплыло.*
*Але і цяпер яшчэ прыемна*
*Што гэта некалі было.*

Аўтар згаданых радкоў — Пятрусь Броўка. З верша пра каханне...

Аднак пішуць іх не толькі паэты.

*Я выпадкова натрапіла на адрас газеты «Звязда» і хачу вам паведаміць, што ніколі не была ў Беларусі, але прачытала пра яе шмат кніг,* — піша **Алена Галаўнёва з Калачынскага раёна Омскай вобласці.** — *Мне вельмі падабаюцца вашы людзі, ваша краіна, вашы «Песняры» і «Верасы» — Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціхановіч... Мне вельмі хочацца менавіта вам паказаць свае вершы ( падборка іх дадаецца) і пачуць прафесійны (?!) водгук.*

Што рабіць, — давядзецца неяк адгукацца... І, вядома ж, прачытаць усе артыкулы, якія дасылае ў рэдакцыю спадар Ш. з Мінска (штосьці, магчыма, падрыхтаваць да друку), усе 30 старонак «праўдзівых гісторый», якія прыйшлі ад спадарыні В. з Салігоршчыны, успаміны дачкі лейтэнанта Б. і многае-многае іншае. Такая работа: як сёння кажуць, цяжка на цяжкай, без ніякай — яшчэ цяжэй. А таму пішыце: калі ласка, са зваротным адрасам і нумарам тэлефона для аператыўнай сувязі і, вядома ж, чытайце.

*У эпоху мабільных тэлефонаў чаго толькі не пачуеш у грамадскім транспарце,* — піша **спадар Шастакоў з Гомеля.** — *Часам і не хацеў бы, але...*

*Ехаў вось неяк у аўтобусе — непадалёк сядзела жанчына, па мабільным некаму расказвала, што ўнук яе ледзь не трапіў у бальніцу (злыя, маўляў, дзеці — ударылі па галаве)... А яна ў паліклініку якраз хадзіла. Дык заадно папыталася ў доктара, ці трэба ўнуку здымак рабіць. «Ён ведаеш што мне сказаў? (гэта ўжо цытата) «Глядзіце самі. Вам відней». Ну ніякай цікавасці, ніякай адказнасці!»*

*Не ведаю, праўду ці няпраўду казала гэтая жанчына,* — піша **спадар Яўген**, — *але ж я на ўсякі выпадак вырашыў, што лепей займацца спортам, а не хадзіць па кабінетах урачоў...*

Як ёсць, так ёсць: да дзеянняў, да правільных учынкаў часам падштурхоўваюць не гучныя прамовы, а штосьці выпадкова пачутае... Альбо прачытанае. Галоўнае — каб разумнае.

**Пошту чытала**
**Валянціна ДОЎНАР.**



Шаноўную каляжанку **Таццяну Іванаўну АНДРЫЕВІЧ**, якая дзесяцігоддзямі з рэдкай добрасумленнасцю прымала, рэгістравала і адпраўляла звяздоўскую пошту, шчыра віншуем з прыгожай круглай датай! Зычым добрага здароўя, бадзёрасці, аптымізму,

Каб зоркі падалі ў руку,
Каб вам —
ва ўсім —
спрыяла неба!
І каб хапала
ў кашальку
На ўсе надзённыя
патрэбы.

**Звяздоўцы.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

11 верасня 2024 г. № 34 (767 )

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# «Дзяржава для чалавека і ў імя чалавека»

## У Мінску адбылося пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці







Фота БелТА.

**Мерапрыемства прысвечана правядзенню пад эгідай Генеральнай Асамблеі ААН Саміту будучыні, які пройдзе сёлета 22—23 верасня ў Нью-Ёрку. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі пытанні выклікаў і пагроз, якія ўзнікаюць падчас дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Асобная ўвага таксама ўдзялялася ўплыву санкцыйнага ціску на ўстойлівае развіццё і ўмацаванне ролі моладзі ў дасягненні МУР.**



— У 2015 годзе ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый была прынята праграма па развіцці МУР. Была выказана неабходнасць развіцця па 17 напрамках, якія ўказаны ў адпаведным дакуменце. Напэўна, любому чалавеку зразумела, што асновай устойлівага развіцця з'яўляецца мірнае суіснаванне. Калі ў свеце не будзе міру, то не будзе і ніякага развіцця», — заўважыў перад пачаткам пасяджэння **Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА**.

Ён адзначыў, што прынятыя 17 напрамкаў датычацца розных сфер: ліквідацыі голаду і галечы, удасканалення комплексу мер па абароне навакольнага асяроддзя, гендарнай роўнасці. «Але ўсё гэта магчыма толькі ў адной сітуацыі: калі ёсць мір, тады ёсць развіццё. Аб гэтым неаднаразова гаварыў наш кіраўнік дзяржавы. Калі размова ідзе аб узаемаадносінах паміж рознымі краінамі, то гэта павінен быць ключавы прынцып», — упэўнены ён.

Гаворачы аб санкцыях, якія ўведзены супраць Беларусі, Сяргей Хаменка акцэнтаваў увагу прысутных на тым, што для іх увядзення павінны былі быць прававыя падставы. Але іх папросту няма, што азначае толькі адно — санкцыі незаконныя, а іх аднабаковае ўвядзенне супярэчыць нормам міжнароднага права. Акрамя таго, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі падкрэсліў, што гэтыя супрацьпраўныя захады недружалюбных краін, якія накіраваны на пэўныя прадпрыемствы або на канкрэтных фізічных асоб, на самай справе ўводзяцца супраць усяго беларускага народа. «На гэтых прадпрыемствах працуюць людзі, і калі ў іх ёсць работа, тады ёсць і развіццё», — падкрэсліў ён.

Сяргей Хаменка таксама звярнуў увагу, што ў Беларусі няма такіх праблем, як галеча, голад ці гендарная няроўнасць. «Яны проста адсутнічаюць. А беларуская сістэма адукацыі з'яўляецца прыкладам, аб чым гавораць прадстаўнікі самых розных дзяржаў. Гэта не пафасныя словы, а рэальнасць: у нас дзяржава для чалавека і ў імя чалавека. Менавіта гэта і ёсць асноўны прынцып рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця», — выказаў упэўненасць спікер. І дадаў, што сённяшняе пасяджэнне прысвечана, акрамя абмеркавання наяўных праблемных пытанняў, яшчэ і пытанням інфармавання. «Мы таксама хочам расказаць, што Беларусь адкрыта для ўсіх. Пры гэтым мы гатовы пераймаць і ўкараняць у нашу рэчаіснасць вопыт, назапашаны іншымі дзяржавамі», — адзначыў Сяргей Хаменка.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння, нацыянальны каардынатар паведаміў, што ў красавіку 2024 года на адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі паступіў ліст Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша з запрашэннем прыняць удзел у Саміце будучыні.

— Кіраўнік дзяржавы ў цэлым падтрымаў ініцыятыву кіраўніка ААН па правядзенні Саміту будучыні, адзначыўшы яе важнасць у справе пераадолення крызісных з'яў у міжнародным жыцці і аднаўлення канструктыўнага дыялогу і супрацоўніцтва паміж усімі краінамі свету. Важна падкрэсліць, што ў сваім пасланні ў адказ Прэзідэнт Беларусі засяродзіў асаблівую ўвагу на неабходнасці пераадолення выклікаў глабальнай палітыкі, якія пагражаюць прагрэсу па Мэтах устойлівага развіцця на планеце, у прыватнасці праз рэалізацыю сваёй ініцыятывы аб запуску глабальнага дыялогу па бяспецы, — расказаў Сяргей Хаменка.

Ён адзначыў таксама, што адным з галоўных драйвераў работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця з'ўляецца ўрад нашай краіны, а паспяховасць гэтай дзейнасці пацвярджаецца міжнароднымі рэйтынгамі. «Так, згодна з дакладамі Праграмы развіцця ААН аб развіцці чалавечага патэнцыялу, Рэспубліка Беларусь на працягу доўгага часу ўтрымлівае пазіцыі ў спісе краін з самым высокім узроўнем развіцця. Акрамя таго, у міжнародным рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця сярод 167 краін Беларусь сёлета перайшла з 34-га месца на 30-е», — падкрэсліў спікер.

Па яго словах, значную ролю ў актывізацыі гэтага працэсу адыграў II Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці. Мерапрыемства сабрала прадстаўнікоў усіх галін улады, мясцовага кіравання, грамадзянскай і акадэмічнай супольнасцяў, глабальных і рэгіянальных міжнародных арганізацый.

— Паказальна, што выніковы дакумент форуму нядаўна быў апублікаваны ў якасці афіцыйнага дакумента Генеральнай Асамблеі ААН на ўсіх шасці афіцыйных мовах арганізацыі. Такім чынам, усе краіны свету маюць магчымасць дэталёва азнаёміцца з нашымі дасягненнямі і дадатковымі абавязацельствамі па тэме ўстойлівага развіцця на найбліжэйшыя гады, — засяродзіў увагу прысутных Сяргей Хаменка.

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі таксама адзначыў, што ацэнка прагрэсу ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця ўвогуле ў свеце яскрава сведчыць: без устаранення ключавых перашкод і бар'ераў, якімі з'яўляюцца войны, канфлікты і незаконныя санкцыі, рухацца наперад становіцца з кожным днём усё цяжэй.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Патрыятычныя ініцыятывы, міжнародныя стасункі і дыялог з моладдзю



### Якім быў працоўны тыдзень сенатараў

• **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Дзмітрый ЖУК** прыняў удзел у прэзентацыі мультыфарматнага патрыятычнага праекта «Абеліскі вялікага подзвігу» ў Бабруйску. Праект, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі і надыходзячай 80-й гадавіне Вялікай Перамогі, створаны, каб нагадаць жыхарам краіны аб старонках баявой славы Беларусі і тых трагічных падзеях, якія выпалі на долю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Па словах сенатара, праект «Абеліскі вялікага подзвігу» заклікаиы нагадаць аб сакральных для нашага народа месцах, каб аб'ектыўная гістарычная памяць не скажалася і эфектыўна ўспрымалася маладым пакаленнем. Дзясяткі ралап-стэндаў з фота і фотакалажамі памятных месцаў, іх кароткім апісаннем, архіўнымі фотадакументамі і QR-кодамі вядуць да прагляду відэаролікаў праекта на спецыяльна створаным Выдавецкім домам «Беларусь сегодня» інтэрнэт-рэсурсе obeliski.by. «Мы знялі з дронаў каля ста мемарыяльных комплексаў. Яны ёсць на YouTube-канале «СБ ТБ». Паколькі гэта інтэрнэт-праект, настаўнікі могуць выкарыстоўваць знятыя ролікі падчас урокаў для дэманстрацыі дзецям», — заўважыў Дзмітрый Жук.

Праект створаны пры падтрымцы ААТ «ААБ Беларусбанк». Як лічыць намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктар Ананіч, моладзь павінна ведаць праўду пра Вялікую Айчынную вайну. «Паглядзіце, калі іншыя краіны зносяць помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, перапісваюць гісторыю, наша дзяржава, дзякуючы ў тым ліку асабістай ініцыятыве Прэзідэнта, прыкладае максімум намаганняў для захавання памяці, ушанаванай у такіх манументах. Разам з дзецьмі і ўнукамі мы нясём да іх кветкі, разам з калегамі падчас суботнікаў прыводзім у парадак. Таму такія праекты — наша невялікая, але шчырая даніна ў памяць аб сапраўдных героях, якімі былі нашы дзяды і прадзеды», — падкрэсліў сенатар.

• **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей АЛЕЙНІК** сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Санцьяга Перэсам Бенітэсам. У час сустрэчы былі абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, актывізацыі парламенцкага ўзаемадзеяння на міжнародных пляцоўках, уключаючы Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, Міжпарламенцкі саюз. Бакі абмяняліся думкамі аб міжнароднай абстаноўцы, пацвердзілі абсалютнае падабенства поглядаў па пытанні фарміравання больш справядлівага шматпалярнага свету, заснаванага на безумоўнай павазе норм і прынцыпаў міжнароднага права. Дасягнута дамоўленасць аб далейшых сумесных кроках па ўмацаванні парламенцкага дыялогу паміж Беларуссю і Кубай.

• **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Канстанцін СІРОЦІН** прыняў удзел у маладзёжнай дыялогавай пляцоўцы, прысвечанай Дню адзінства, у ААТ «Магілёўхімвалакно». Падчас размовы былі абмеркаваны актуальныя тэмы, якія хвалююць маладых супрацоўнікаў прадпрыемства. Асаблівы акцэнт — на значнасці Дня народнага адзінства. «Дзень народнага адзінства — гэта не проста свята ў календары, — звярнуў увагу сенатар. — Гэта важная вяха ў гісторыі Беларусі, якая сімвалізуе згуртаванне нашага народа і сілу адзінства. Гэты дзень нагадвае нам пра тое, як важна захоўваць мір і згоду ў грамадстве».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ СЯРОД НАС НЯМА...»

## Удзельнікі маладзёжнага парламента пра важнасць той справы, якой займаюцца

**Маладзёжны парламент пры Магілёўскім гарсавеце існуе 10 гадоў, дата яго заснавання — 16 верасня. З гэтай нагоды плануецца правесці ў Магілёве розныя святочныя мерапрыемствы, арганізаваць тыдзень парламентарызму. Не выключна, што ўдзел у свяце возьмуць аднагодкі з іншых гарадоў і нават абласцей. Можна будзе заадно і вопытам абмяняцца. Добрых і карысных спраў за дзесяць гадоў зроблена нямала. Нашы сённяшнія суразмоўнікі расказалі, наколькі істотна парламент дапамагае ім рэалізавацца, уплываць на маладзёжную палітыку, прасоўваць свае праекты, фарміраваць грамадскую думку сярод аднагодкаў.**



Маладзёжны парламент у справах.

### «КРОПЛЯ ЖЫЦЦЯ» І «ВАЛЬС ПЕРАМОГІ»

У складзе Маладзёжнага парламента Магілёва — школьнікі, навучэнцы, студэнты, працоўная моладзь — усяго 92 чалавекі. Стваралася суполка з мэтай распаўсюджвання ідэй маладзёжнага парламентарызму, павышэння матывацыі сярод моладзі для ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці горада, фарміравання ў юнакоў і дзяўчат актыўнай грамадзянскай пазіцыі, папулярызацыі сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання, выяўлення лідараў маладзёжнага руху, магчымасці ўдзелу ў распрацоўцы і рэалізацыі гарадскіх праграм. Вядома, для гэтага трэба быць чалавекам неабыякавым і мець грамадзянскую пазіцыю.

— Трапіць у нашы шэрагі не так проста, выпадковых людзей тут няма, — удакладняе **старшыня Маладзёжнага парламента пры Магілёўскім гарсавеце Дзіяна КАМАРОВА, студэнтка 4 курса МДУ імя А. Куляшова**. — Я, напрыклад, не проста жыву — дыхаю грамадскім жыццём. Удзельнічала ва ўсіх універсітэцкіх мерапрыемствах, вось мяне і прыкмецілі, вылучылі ў парламент. Школьнікі наогул праводзяць у сябе выбары, каб вылучыць самых годных.

Дзіяна наўскідку пералічвае, што карыснага было зроблена апошнім часам. Тут і ўдзел у акцыях, і суботнікі, і дапамога ветэранам, і набыццё корму для бяздомных жывёл, і арганізацыя сумесных праектаў з аднагодкамі з Расіі, і патрыятычныя мерапрыемствы... Тая ж акцыя «Вальс Перамогі» праводзіцца кожны год, моладзь танцуе на плошчы Славы і на плошчы Зорак. А сёлетнім спякотным летам праз сацсеткі распаўсюдзілі заклік да ўдзелу ў акцыі «Кропля жыцця», запрашалі магілёўчан браць з сабой бутэлечкі з вадой і паліваць гарадскія кветкі, каб яны не сохлі і працягвалі ўпрыгожваць горад.

— Тыя, хто лічыць, што нашы справы робяцца дзеля галачкі і не патрабуюць асаблівых намаганняў, глыбока памыляюцца, — кажа Дзіяна. — Мы вельмі шмат сіл укладваем у тое, што робім. Тыя ж выбары, напрыклад. Мы выступалі сярод аднагодкаў, расказвалі, навошта гэта трэба. На сваёй сесіі праводзілі выбарчую дыктоўку, якую прыдумалі, каб павысіць прававы ўзровень моладзі. Ніводная гарадская падзея не абыходзіцца без нашага ўдзелу. Нам важна, каб наш горад быў прыгожы і ўтульны. І мы вельмі ўдзячны гарсавету і гарвыканкаму за тое, што яны дапамагаюць нам рэалізаваць нашы ідэі.



Захару Бычкову парламент дапамог вызначыцца з ВНУ.

### АКАДЭМІЯ І ТАПІНАМБУРАВЫ ЗАВОД

**Выпускнік Магілёўскага абласнога ліцэя № 3 Захар БЫЧКОЎ** сёлета стаў студэнтам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Расказвае, што да Маладзёжнага парламента думаў паступаць на хімічны факультэт, бо меў высокія вынікі ў алімпіядах па гэтым прадмеце на абласным і нават рэспубліканскім узроўні. Але за час работы ў Маладзёжным парламенце планы кардынальна памяняліся. Ён стаў удзельнікам праекта «Школа кіравання» пры Акадэміі, які быў запушчаны летась з мэтай падрыхтоўкі моладзі для паступлення ў ВНУ. Вучоба вялася дыстанцыйна, раз на месяц моладзь прыязджала ў Мінск для ўдзелу ў розных мерапрыемствах. Захар расказвае, што прысутнічаў на прэс-канферэнцыі з удзелам расійскага палітычнага дзеяча Сяргея Лаўрова, як член валанцёрскага руху Міністэрства замежных спраў браў удзел у прэс-турах з прадстаўнікамі СМІ краін ШАС. І вопыт, атрыманы за год работы ў Маладзёжным парламенце, вельмі спатрэбіўся. У ліцэі № 3, дарэчы, ёсць асобны парламент, яго актыў з прадстаўнікоў з розных класаў збіраецца кожную сераду для абмеркавання актуальных пытанняў. Але парламент пры гарсавеце — гэта больш высокая прыступка.

— Мне вельмі спадабалася, што нас запрашалі на сесіі Магілёўскага гарсавета, на падвядзенне вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця за 2023 год горада і вобласці. А таксама на мерапрыемствы з удзелам членаў Савета Рэспублікі, — кажа суразмоўніца. — Гэта добры вопыт, які дае разуменне, як працуе заканадаўчая галіна ўлады. Праходзіла шмат дыялогавых пляцовак з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — Наталлі Тарасенка, Людмілы Здорыкавай. Калі яны працавалі ў акрузе, а ў мяне быў вольны час, я далучаўся да іх. З Людмілай Яўгенаўнай праводзілі маніторынг цэн, разам з ёй і Наталляй Эдуардаўнай удзельнічаў у дапамозе шматдзетным сем'ям, наведваў дзяцей-сірот, дзіцячы хоспіс. Разам з дэпутатамі Галінай Бяляевай, Наталляй Куляшовай, Уладзімірам Падабедам віншаваў ветэранаў, браў удзел у добрых справах. Маладзёжны парламент даў магчымасць паназіраць, як працуюць народныя выбраннікі і навучыцца прыносіць дабро людзям.

Менавіта жаданне дапамагаць натхніла Захара на праект з тапінамбуравым заводам.

— Я не паспеў яго рэалізаваць у Маладзёжным парламенце, але завяршу да канца года і падам на конкурс «100 ідэй для Беларусі», — дзеліцца ён планамі. — Ёсць сорт тапінамбуру, які ўтрымлівае ў сухім астатку 60 % інуліну. Цяпер інулін атрымліваюць у асноўным з каранёў цыкорыі, але танней яго замяніць на тапінамбур. Я падлічыў, што з гектара гэтай расліны чыста на інуліне можна атрымліваць прыкладна да 3 мільёнаў беларускіх рублёў. Я ўжо не кажу пра іншыя карысныя ўласцівасці тапінамбуру. Культура вельмі шматфункцыянальная і карысная. Асобныя яго часткі можна пускаць на камбікорм і біяпаліва. Калі мой праект зацікавіць кіраўніцтва Магілёва або прадпрымальных людзей, якія дапамогуць яго рэалізаваць, буду вельмі рады. Маладзёжны парламент даў мне зразумець, што грамадская справа — гэта маё, і ёй лепш займацца, не адкладваючы на потым. Для моладзі, як сказаў Прэзідэнт, у нас усе дзверы адчынены. Калі ёсць жаданне, трэба спрабаваць.

### ЭРУДЗІРАВАНЫЯ Ў ПАРЛАМЕНЦЕ ПАТРЭБНЫ

Сёлета Маладзёжны парламент Магілёва распрацаваў другі гарадскі маладзёжны інтэлектуальны КВІЗ «Пра_Беларусь», які прайшоў у абласным цэнтры напярэдадні Дня Незалежнасці. Гарадскія ўлады дапамаглі толькі з арганізацыяй сустрэчы і падрыхтоўкай дыпломаў. Мерапрыемства праводзілася ў рамках рэспубліканскай дэкады моладзі «Moladz.by: цэнім мір, ствараем будучыню». У ім прынялі ўдзел 10 каманд. КВІЗ распрацавала **прадстаўніца працоўнай моладзі ў парламенце Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА**. Па адукацыі яна выкладчык геаграфіі і біялогіі, скончыла МДУ імя А. Куляшова. І ёй вельмі блізкія краязнаўчая і грамадзянска-патрыятычная тэмы.

— Пэўны час працавала ў школе, потым у каледжы і з навучэнцамі праводзіла ўрокі інтэлектуальнай накіраванасці па праблемных пытаннях, — расказвае дзяўчына.— Рабіла інтэлектуальныя ўрокі ў фармаце КВІЗаў, «Што? Дзе? Калі?». Бачыла станоўчы водгук, дзецям падабаецца вучыцца ў гульнявой форме. Паралельна сама больш за шэсць гадоў гуляю ў гарадскіх турнірах «Што? Дзе? Калі?», «Мазгабойнік» і іншых. Усе свае веды ўвасабляю ў інтэлектуальных гульні. Калі трапіла ў Маладзёжны парламент і ў мяне пацікавіліся, што б я магла карыснага зрабіць, адразу ж агучыла, што хацела б распрацаваць КВІЗ для дарослых. І гэта атрымалася.

Вераніка лічыць, што без Маладзёжнага парламента так і засталася б у рамках школы. Яна шмат гадоў займалася інтэлектуальнымі гульнямі з адным класам, а цяпер выйшла на маштаб горада. І гэта натхняе.

— Я чалавек вельмі актыўны, падтрымліваю годныя ініцыятывы, — кажа суразмоўніца. — Вельмі моцным у нас атрымаўся сумесны з расіянамі патрыятычны відэапраект да 9 Мая. Расіяне здымалі ў сябе, а мы — у сябе. Для здымак на Буйніцкім поле збіралі разам з гарвыканкамам і гарсаветам актыўных маладых людзей. Вельмі парадавала, што шмат хто адгукнуўся. Здымалі яшчэ адно месца смутку ў Магілёве — мемарыял на месцы Лупалаўскага лагера смерці на праспекце Шміта. Каб паказаць сувязь пакаленняў, у здымках задзейнічалі выхаванцаў найбліжэйшага дзіцячага садка і ветэранаў. Праект атрымаўся да слёз...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіваў суразмоўнікаў.**



Дзіяна Камарова: «Грамадская дзейнасць — гэта маё»
*(Дзіяна крайняя справа).*



Вераніка Лебедзева:
«Маёй марай было распрацаваць карысны КВІЗ для дарослых».

**У тэму**

**Максім ГУРЫН, старшыня Магілёўскага гарсавета:**

— Тое, што мы сёння ўкладзём у нашу моладзь, заўтра будзе працаваць на карысць краіны. У Магілёве актыўна падтрымліваецца маладзёжны рух. На прыкладзе супрацоўніцтва і падтрымкі гарсавета дэпутатаў з Маладзёжным парламентам рэалізоўваюцца многія праекты. Яны нашы пастаянныя памочнікі ва ўсіх дзяржаўных, грамадскіх, палітычных справах. Вучацца на нашых прыкладах, працуюць з ветэранамі, наогул — па ўсіх кірунках. Дзесяцігоддзе Маладзёжнага парламента — знакавая дата, і мы прымеркавалі да яе шэраг мерапрыемстваў пад эгідай гарсавета. Гэта сесіі, семінары — плануем вялікае мерапрыемства правесці, запрасіць тых, хто быў у папярэдніх чатырох скліканнях. Усяго за 10 гадоў адбылося пяць скліканняў, пятае — яшчэ дзеючае. Сёння многія маладыя людзі з папярэдніх скліканняў працуюць кіраўнікамі і добра паказваюць сябе ў грамадзянскіх справах. Усё гэта сведчыць, што змена ў нас расце годная.

# «Дзяржава для чалавека і ў імя чалавека»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Найлепшае настаўленне да дзеяння па дасягненні Мэт устойлівага развіцця — словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: «Скончыўшы з войнамі і канфліктамі, міжнародная супольнасць атрымае дастаткова рэсурсаў, каб справіцца і з кліматычнымі зменамі, і з іншымі агульнымі глабальнымі выклікамі». Удзел у Саміце будучыні з'яўляецца дзейсным інструментам для інфармавання шырокай міжнароднай грамадскасці аб рэальным становішчы спраў, сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, якое праходзіць пад лозунгам «Усё для чалавека, усё ў імя чалавека», аб той міралюбнай знешняй палітыцы, якую праводзіць кіраўніцтва нашай дзяржавы, і аб захаванні гістарычнай памяці і традыцый усіх народаў як падмурка будучыні, — падкрэсліў нацыянальны каардынатар. — Беларусь гатова да вывучэння аналагічнага замежнага вопыту, а таксама да ўдзелу ў выпрацоўцы сумесных міжнародных рашэнняў, у першую чаргу накіраваных на мірнае суіснаванне як аснову развіцця будучыні.

У дадатак ён таксама адзначыў, што наша краіна надае важнае значэнне маючай адбыцца сустрэчы: «Нашы прадстаўнікі актыўна ўдзельнічаюць у міжурадавым дыялогу па ўзгадненні праекта выніковага дакумента саміту — Пакта ў імя будучыні. Такім чынам, значнасць правядзення сённяшняга пасяджэння савета напярэдадні саміту відавочная».

**Пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Расул БАГІРАЎ** у сваю чаргу адзначыў, што ў нашай краіне дасягненню Мэт устойлівага развіцця ўдзяляецца асаблівая ўвага, гэта з'яўляецца неад'емнай часткай развіцця дзяржавы. А колькасць мерапрыемстваў у гэтым кірунку сапраўды ўражвае. Асобна ён падкрэсліў, што ў Беларусі створана эфектыўная сістэма іх рэалізацыі. Гэта, як і сумесная работа ўсіх зацікаўленых бакоў, абавязкова будзе і надалей спрыяць дасягненню МУР.



Фота БелТА.

З дакладамі аб мерапрыемствах па дасягненні Мэт і агульным стане спраў па пэўных кірунках выступілі прадстаўнікі беларускага ўрада, навукоўцы і эканамісты. Яны адзначылі негатыўны ўплыў неабгрунтаваных санкцый на рэалізацыю праграмы па развіцці Мэт устойлівага развіцця, аднак разам з тым канстатавалі, што Беларусь паспяхова справілася з цяжкасцямі і сёння ўпэўнена рухаецца наперад.

Асобным радком была азначана тэма павышэння ролі моладзі ў дзейнасці ў сферы дасягнення Мэт устойлівага развіцця. «Ад іх актыўнасці, упэўненасці ў неабходнасці іх работы непасрэдна залежыць поспех запланаваных у нашай дзяржаве мерапрыемстваў», — зазначыў Сяргей Хаменка.

Таксама падчас пасяджэння эксперты, у тым ліку і з краіновай каманды ААН, абмеркавалі ключавыя пытанні парадку дня Саміту будучыні. Усе меркаванні і ацэнкі бягучай сітуацыі будуць прааналізаваны і асэнсаваны пры фармуляванні пазіцыі беларускай дэлегацыі.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# АД ПАРКУ САПЕГАЎ ДА МУЗЕЙНАГА КОМПЛЕКСУ

## У Дзярэчыне пачалі рэалізацыю новай грамадзянскай ініцыятывы

**У рамках чарговага праекта з'явіцца тэматычны музейны пакой і будзе добраўпарадкавана гістарычнае месца аграгарадка. На гэтыя мэты ў рамках конкурсу атрымана парадку 16 тысяч рублёў, яшчэ 10 працэнтаў сумы сабралі мясцовыя жыхары.**

### Пачатак паклаў Версаль

Дзярэчын — пасёлак з багатай гістарычнай спадчынай. Ён налічвае больш за 600 гадоў толькі з моманту яго згадвання і з'яўляецца адным з найстарэйшых населеных пунктаў Зэльвенскага раёна. Калісьці тут знаходзілася адна з раскошных рэзідэнцый уплывовых і знакамітых князёў Сапегаў, што дало мястэчку тагачасную назву «малога Версаля». Рэзідэнцыя тая, на жаль, не захавалася, а вось парковая зона са старымі дрэвамі дажыла да нашага часу. Не так даўно ў Дзярэчыне задумаліся аб тым, каб 18 гектараў зямлі прывесці ў парадак.

Каб было, з чаго пачаць, вырашылі ўзяць удзел у першым конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў, арганізаваным Гродзенскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў пры падтрымцы абласнога Савета дэпутатаў. Праект увайшоў у лік пераможцаў.

У хуткім часе парк Сапегаў атрымаў новае аблічча. Як паведаміў старшыня Дзярэчынскага сельсавета Аляксандр Белякала, тут з'явіліся дарожкі, альтанкі, ліхтары, клумбы, драўляныя скульптуры, дзіцячая гульнявая пляцоўка і сцэна для правядзення масавых мерапрыемстваў. Новы парк быў урачыста адкрыты два гады таму падчас раённых Дажынак. Цяпер гэта месца стала традыцыйным у правядзенні свята хлебаробаў мясцовага сельгаспрадпрыемства «Галынка». Дарэчы, менавіта гаспадарка





прыняла эстафету праекта і завяршыла работы па добраўпарадкаванні паркавай зоны.

### Працяг гістарычнай тэмы

Так здарылася, што пасёлак перажыў нямала разбуральных войнаў. Да сярэдзіны XIX стагоддзя тут ад былой славы амаль нічога не засталося. Між тым выхоўваць патрыятызм у моладзі немагчыма без прыкладаў гераічнага мінулага, бо губляецца сувязь з роднай зямлёй, яе каранямі.

— Гэта праблема неаднойчы агучвалася жыхарамі аграгарадка падчас сустрэч з кіраўніцтвам раёна. Пытанне не засталося без увагі. У будынку сельвыканкама былі выдзелены плошчы пад музейныя пакоі, дзе меркавалася адлюстраваць гісторыю пасёлка. Сельгаспрадпрыемства «Галынка» выдаткавала сродкі на рамонт памяшканняў. Работнікі культуры і мясцовыя энтузіясты падключыліся да афармлення музея, — паведаміла **галоўны спецыяліст сектара культуры Зэльвенскага райвыканкама Наталля МАТВЕЙЧЫК**.

Такім чынам, некалькі гадоў таму адбылося адкрыццё музея ў Дзярэчыне. Сабраны матэрыял расказваў аб гістарычным шляху пасёлка, але некаторыя важныя падзеі не ў поўнай ступені былі адлюстраваны. Гэту задачу якраз і вырашыць новы праект грамадзянскіх ініцыятыў «Ступені гісторыі Дзярэчына». За перамогу ў конкурсе атрыманы грант парадку 16 тысяч рублёў. Яшчэ 10 працэнтаў гэтай сумы сабралі мясцовыя жыхары.

Па словах **аднаго з ініцыятараў грамадзянскай ініцыятывы, метадыста Цэнтра культуры і народнай творчасці Генадзя КАЎША**, праект уключае ў сябе зварот да дзвюх эпох. Адна з іх — гэта перыяд вайны з войскамі Напалеона 1812 года. У Дзярэчыне пахаваны расійскі палкаводзец Ермалай Гампер — удзельнік баёў з французскай арміяй, корпус якога дыслацыраваўся ў пасёлку. За сродкі праекта мяркуецца добраўпарадкаваць яго магілу — адрамантаваць старажытную пліту і паставіць помнік.

Другая частка праекта звязана ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У яго рамках прадугледжана стварэнне яшчэ аднаго музейнага пакоя. У ім будуць размешчаны стэнды і экспанаты, якія раскажуць, у прыватнасці, аб мясцовым гета, праз які прайшло каля чатырох тысяч чалавек. Адно з невядомых дагэтуль месцаў пахавання было выяўлена падчас раскопак 2013 года. Астанкі 50 ахвяр перапахавалі.

— Відавочна, што падзеі мінулага не сышлі ў нябыт, удзячныя нашчадкі ўвекавечваюць іх памяць, разам з тым вяртаюць Дзярэчыну былую славу. Мне, як мясцоваму жыхару, гэта вельмі прыемна, — кажа Генадзь Коўш. — Канешне, «малым Версалем» наўрад ці станем, але наблішацца варта. Каб і турыстам было тут цікава.

Дарэчы, турыстычную тэму трымае на кантролі і старшыня сельсавета Аляксандр Белякала. Асабліва пасля таго, як да гэтага праявілі цікавасць расійскія партнёры з Калінінградскай і Ніжагародскай абласцей. У Дзярэчыне нямала цікавых аб'ектаў. Гэта і велічныя храмы, якія ўваходзяць у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, і старыя яўрэйскія могілкі, і вялізная калона каля дарогі XVIII стагоддзя. Цяпер у Дзярэчыне працуюць над турыстычным маршрутам, куды ўвойдуць і аб'екты, створаныя ў рамках конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў.

### Карысная работа

Па выніках трох конкурсаў, якія праводзіцца Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў сумесна з абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў, да канца года будзе рэалізавана 15 ініцыятыў. На іх фінансаванне выдзелена больш за 400 тысяч рублёў. Пры гэтым 109 тысяч дэпутаты вырашылі ўнесці дадаткова.

— Гэта дазволіць добраўпарадкаваць пляцоўкі для дзяцей, стварыць месцы прыцягнення мясцовых жыхароў і даць штуршок новым праектам. Людзі хочуць бачыць рэальныя справы, якія дапамагаюць палепшыць іх жыццё, яны гатовы праяўляць ініцыятыву дзеля карыснага выніку, — зазначыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**.

На яе думку, конкурс грамадзянскіх ініцыятыў — прадукцыйная і слушная ідэя, якая не толькі скіравана на паляпшэнне якасці жыцця, але і дапамагае ў кансалідацыі грамадства. А вынікі агульнай працы фарміруюць пачуццё еднасці і вельмі цэняцца ўсімі, хто задзейнічаны ў працэсе, упэўнена лідар дэпутацкага корпуса Гродзеншчыны.

На першым этапе конкурсу, які стартаваў напрыканцы мінулага года, было разгледжана 36 заявак. Пераможцамі сталі шэсць праектаў, над якімі ідзе канкрэтная работа. Чарговы разгляд васьмі праектаў вылучыў яшчэ трох пераможцаў. У іх ліку дабрачынная арганізацыя, якая займаецца работай з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі. У рамках другога праекта ў Мастах з'явіцца навес над сцэнічнай пляцоўкай. Трэці праект звязаны з абрадам выпечкі Паўлаўскіх караваяў у Слонімскім раёне. Вынікам рэалізацыі стане стварэнне пляцоўкі для правядзення брэндавага свята.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота дадзена сектарам культуры Зэльвенскага райвыканкама і з адкрытых крыніц.**

# СУЧАСНЫ ПАДЫХОД

## Ініцыятыва дэпутатаў у дзеянні

**На Гомельшчыне дэпутаты Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў прапанавалі жыхарам свайго рэгіёна разам вучыцца камунікацыі, развіццю лідарскіх якасцяў і ініцыятыўнасці, актыўна ўключацца ў жыццё горада і раёна. Першая ў сваім родзе на Жлобіншчыне адукацыйная ініцыятыва дэпутатаў атрымала такі жывы водгук ад жыхароў, што праект вырашылі працягнуць і пашырыць для ўдзельнікаў усіх узростаў.**



«Развіццё» — так коратка і ёмка назвалі першы ў Жлобіне пілотны праект дэпутаты. Яго ініцыявала камісія па адукацыі, культуры, спорце, маладзёжнай палітыцы Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў. Куратарам праекта стаў 26-гадовы дэпутат раённага Савета дэпутатаў Аляксей Прыходзька. Малады чалавек — майстар па кантрольна-вымяральных прыборах і сродках аўтаматыкі ўчастка па рамонце і абслугоўванні кантрольна-вымяральных прыбораў і сродкаў аўтаматыкі на Беларускім металургічным заводзе.

— Ажыццявіць ідэю ў жыццё ўдалося дзякуючы актыўнай падтрымцы калег па раённым дэпутацкім корпусе, нашых жыхароў, — падкрэсліў Аляксей Прыходзька. — Падтрымалі нас і кіраўнікі прадпрыемстваў. Выдзелілі памяшканне для правядзення сустрэч з удзельнікамі. Адгукнуліся спецыялісты прадпрыемстваў і арганізацый, якія сталі спікерамі на сустрэчах, дзе былі запланаваны прафесійныя кансультацыі. Спікерамі выступілі і самі дэпутаты райсавета.

Праект «Развіццё» ўяўляе сабой сетку адукацыйных мерапрыемстваў. Першы пілотны этап прайшлі 27 чалавек. Гэта жыхары Жлобіна ўсіх узростаў: ад школьнікаў да вопытных спецыялістаў розных прадпрыемстваў. У праекце прынялі ўдзел жыхары горада, якія раней не прымалі актыўны ўдзел у мерапрыемствах у раёне, але хацелі б.

— Заняткі спалучылі тэорыю і практыку. Праходзілі сустрэчы з ліпеня да жніўня кожную суботу, — растлумачыў куратар праекта Аляксей Прыходзька. — Адной з запрошаных спікераў-экспертаў нашых сустрэч стала намеснік начальніка цэнтра банкаўскіх паслуг Белаграпрамбанка Святлана Ясінская, якая правяла заняткі на тэму «Фінансы, улік, зберажэнні». Адгукнуўся на ініцыятыву правёў сустрэчу працаўнік БМЗ, дэпутат раённага Савета дэпутатаў Арцём Макарэвіч. Шматдзетны бацька і шчаслівы сем'янін, ён правёў сустрэчу па тэме «Сям'я, поспех, дзеці». Оперупаўнаважаны аддзялення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці аддзела ўнутраных спраў Жлобінскага райвыканкама Віталь Саўчанка правёў заняткі па тэме «Бяспека, фінансы, ашуканцы». Распавёў, як засцерагчы сябе і сваіх родных ад уцягвання ў махлярскія злачынствы, — дадаў Аляксей Прыходзька.

Сам малады дэпутат на занятках дзяліўся сваімі ведамі па практыках асобаснага росту і тайм-менеджменце.

— У свой час у мяне была магчымасць навучацца на курсах па гэтых кірунках. Не ва ўсіх нашых жыхароў, якія таксама цікавяцца такімі практыкамі, ёсць фінансавая магчымасць прайсці такое навучанне. У нашым праекце такая магчымасць ёсць, да таго ж абсалютна бясплатна. Праводзіў заняткі па тэмах «План, час, вынік», «Пытанне, адказ, дыялог». Рады, што магу быць карысны людзям, дзяліцца вопытам, — патлумачыў Аляксей Прыходзька.

Сёння Жлобінскі раённы Савет дэпутатаў працягвае далей развіваць адукацыйны праект «Развіццё». Цяпер рыхтуецца чарговы набор удзельнікаў, які зможа ахапіць большую колькасць ахвотных.

— Прынята рашэнне набіраць удзельнікаў у праект кожны квартал. Члены Маладзёжнага савета пры Жлобінскім раённым Савеце дэпутатаў, які якраз абіраецца ў верасні, будуць адказваць у праекце за мерапрыемствы для школьнікаў і студэнтаў, — удакладніў Аляксей Прыходзька. — Для школьнікаў і студэнтаў будуць праводзіцца не толькі розныя сустрэчы, але і знаёмствы з грамадскімі аб'яднаннямі раёна, паездкі па памятных мясцінах рэгіёна, практычныя заняткі па навыках камунікацыі, таму што ў дзяцей і падлеткаў з гэтым узнікаюць праблемы. Такія заняткі ў тым ліку дапамогуць падлеткам у далейшым быць больш падрыхтаванымі да камунікацыі ў працоўным калектыве. Для школьнікаў у межах праекта будзем праводзіць мерапрыемствы па прафесійнай арыентацыі.

Як падзяліўся Аляксей Прыходзька, вельмі важна, што праект «Развіццё» дапамагае яго ўдзельнікам у тым ліку лепш зразумець сутнасць работы дэпутатаў.

— Упэўнены, што важна не толькі расказваць аб дзейнасці народных абраннікаў, але і даць магчымасць людзям знутры даведацца, як рэалізоўваюцца ініцыятывы дэпутатаў, што яны даюць людзям, чаму важна разам шукаць шляхі вырашэння ўсіх хвалюючых пытанняў, — падкрэсліў малады дэпутат.

Самі ўдзельнікі праекта змаглі асабіста падзякаваць арганізатарам за магчымасць такога навучання, даць зваротную сувязь па праекце. Найбольш актыўных удзельнікаў дэпутаты адзначылі на выніковай сустрэчы першага этапу праекта. Сертыфікаты аб праходжанні навучання ўдзельнікам уручыла старшыня Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў Валянціна Няхай.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва героя публікацыі.**

# Бусел над абгарэлым комінам

## Ініцыятыву па ўстаноўцы помніка спаленым вёскам рэалізоўваюць у Ляхавіцкім раёне

**У сваім нядаўнім інтэрв'ю «Мясцоваму самакіраванню» старшыня Брэсцкага абласнога Савета, сенатар Ігар Брылевіч расказаў аб пяці ініцыятывах, якія перамаглі на конкурсе, арганізаваным абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў. Адна з іх датычыць захавання гістарычнай памяці. У Ляхавіцкім раёне плануецца ўстанавіць помнік спаленым вёскам.**

— Ідэя рэалізоўваецца ў знакавы для нашай краіны юбілей — 80-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — сказаў **старшыня Ляхавіцкага раённага Савета Юрый ЧАРАНКЕВІЧ**. — На жаль, у нашым раёне ўжо не засталося жывых ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Але іх нашчадкі памятаюць, якой цаной заваяваны мір на нашай зямлі, памятаюць спаленыя фашыстамі, нярэдка разам з жыхарамі, вёскі, памятаюць герояў і ахвяры часоў ваеннага ліхалецця.

Гады акупацыі сталі жахлівай паласой для дзясяткаў населеных пунктаў раёна. Ледзь не ў кожнай вёсцы ў той час аплаквалі родных, а ў асобных і аплакваць не было каму. Некаторыя вёскі карнікі спалілі амаль дашчэнту. У кожнай былі і людскія ахвяры. Напрыклад, у Свяціцу карны атрад наляцеў у сакавіку 1943 года, спалілі 200 хат, загінулі 106 жыхароў. У Трабавічах згарэла 20 хат, загінула восем жыхароў. Чэрвеньскім днём 1944 года ў Тухавічах спалілі 106 хат, забілі 15 жыхароў. Праз месяц у Станчыках спалілі 32 сядзібы, загубілі 8 чалавек. У Мядзведзічах захопнікі спалілі 49 хат, загінулі 73 жыхары. Перасталі існаваць хутары, якія налічвалі адну, дзве, тры хаты. Гэты жалобны спіс — аж 48 населеных пунктаў.

Так было і з Марыновам, зусім невялікай вёскай, якая мае даволі працяглую гісторыю. Звесткі пра мінулае населенага пункта захоўвае Ляхавіцкая раённая бібліятэка. Клапатлівым бібліятэкарам удалося знайсці запісы, датаваныя 1870 годам, дзе згадвалася Марынова. А, напрыклад, у 1909 годзе тут жылі 140 чалавек, значылася ўсяго 16 двароў, але пры гэтым працавала школа. Жыхары населенага пункта спрадвеку сеялі хлеб, гадавалі дзяцей. З 1921 года Марынова было ў складзе Польшчы, з 1939-га — у складзе БССР.

На трэці дзень вайны ўся віна гэтай невялікай вёскі па дарозе Брэст—Слуцк заключалася ў тым, што яна аказалася на шляху захопнікаў. Фашысты спалілі 16 двароў, траіх жыхароў, якія не паспелі схавацца, забілі.

— Геаграфічнае становішча вёскі і вызначыла выбар лакацыі помніка, які неўзабаве з'явіцца ўздоўж аўтамабільнай дарогі рэспубліканскага значэння Р-43. У гэтым месцы яго зможа пабачыць максімальная колькасць людзей, — гаворыць старшыня раённага Савета. — У верасні чакаем, што нарэшце атрымаем доступ да фінансавання і пачнём выраб помніка.

Ідэя зрабіць памятны знак спаленым вёскам нарадзілася і атрымала падтрымку многіх людзей раёна два гады таму. Ініцыятарам рэалізацыі праекта па прапанове аддзела ідэалагічнай работы і па справах






моладзі стаў менавіта раённы Савет. Ідэю падтрымалі дэпутаты, афармілі як грамадзянскую ініцыятыву, накіравалі ў абласны Савет. Папярэдне былі праведзены гутаркі ў працоўных калектывах. Як вядома, рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў прадугледжвае ўдзел, у тым ліку фінансавы, грамадзян.

Важна, што добрая справа рухаецца да яе лагічнага завяршэння. І праект помніка ў выглядзе трох спаленых комінаў, над якімі ўздымаецца бусел, як сімвал страчанага гнязда і загінулых людзей, ужо чакае свайго ўвасаблення.

— Адкрыты банкаўскі рахунак, на які можна пералічыць грошы. Сёлета будзе зроблены і ўстаноўлены сам помнік, абсталявана пляцоўка. А добраўпарадкаванне навакольнай тэрыторыі, уладкаванне паркоўкі, пад'езда стане справай наступнага года, — гаворыць Юрый Чаранкевіч. — Думаю, зробім так, што не сорамна будзе сустрэць любую экскурсію. І галоўнае, каб нашым дзецям, школьнікам раёна было дзе правесці наглядны ўрок гісторыі. А падобныя ўрокі патрэбны, каб ніколі не паўтарылася трагедыя. Такую ж ідэю заклалі ў аснову аўтары праекта памятнага знака.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.802. Нумар падпісаны ў 19.30 10 верасня 2024 года.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Бацькам на заметку

# ЯСНЫ ПОЗІРК У БУДУЧЫНЮ

## Як захаваць добры зрок свайму дзіцяці?

**Навукоўцы лічаць, што 80 % інфармацыі аб навакольным свеце мы атрымліваем дзякуючы зроку. Страчваючы здольнасць бачыць або губляючы вастрыню зроку, людзі сутыкаюцца з істотнымі зменамі ва ўласным жыцці. Прафілактыка хвароб вачэй дапамагае пазбегнуць падобных непрыемных змен. Не сакрэт, што займацца ёй трэба з самага ранняга ўзросту. Як захаваць зрок, расказала ўрач-афтальмолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Марына СУХАРУКАВА.**

***— Марына Віктараўна, якая самая распаўсюджаная праблема са зрокам у дзяцей? З-за чаго яна ўзнікае?***

— Найбольш часта ў школьнікаў сустракаецца блізарукасць, і яна можа прыводзіць да сур'ёзных парушэнняў зроку. У папярэджанні блізарукасці вялікую ролю адыгрывае святло, асабліва ў ранішнія гадзіны, калі на арганізм аказваюць інтэнсіўнае ўздзеянне ўльтрафіялетавыя прамяні. Неабходна як мага больш бываць на паветры ў перыяд максімальна інтэнсіўнага дзеяння ўльтрафіялетавай радыяцыі. Гэта важна не толькі для аднаўлення працаздольнасці арганізма, але і для адпачынку вачэй. Вялікае значэнне для добрага зроку мае правільнае харчаванне з дастатковай колькасцю вітамінаў, асабліва D і А. Няправільная пасадка школьніка за сталом або партай таксама можа паслужыць прычынай парушэння зроку.

***— Як жа зберагчы зрок? Якія асноўныя правілы для школьнікаў?***

— Нельга прыступаць да выканання дамашняга задання адразу пасля прыходу са школы. Гэта ўплывае на зніжэнне глядзельных функцый. Гадзіна адпачынку пасля заняткаў у школе значна памяншае агульную стомленасць дзяцей, што суправаджаецца паляпшэннем глядзельных функцый. Таму дома, як і ў школе, заняткі, якія патрабуюць напружання зроку, варта чаргаваць з такімі, калі орган зроку напружваецца менш. Рэкамендуецца рабіць 10—20-хвілінныя перапынкі пасля дзвюх гадзін бесперапынных заняткаў. Аднак, як паказваюць назіранні, многія бацькі грэбуюць гэтымі рэкамендацыямі. Часам дзеці наведваюць некалькі школ, заняткі ў гуртках, танцы і г. д., што вядзе да перагрузкі ўсяго арганізма, у тым ліку і глядзельнага аналізатара.

***— Як правільна для зроку арганізаваць рабочае месца школьніка?***

— Сапраўды, кожны школьнік павінен мець правільна арганізаванае месца для заняткаў: пісьмовы стол, крэсла, кніжная шафа ці паліца дома і скарэкціраваную па яго росце парту ў класе.

Перш за ўсё, важна стварыць прыдатныя ўмовы працы для вачэй. Адно з іх — асветленасць. Напрамак асноўнага светлавога струменя натуральнага асвятлення павінен быць левабаковым ці прамым. Святло ад лямпы павінна быць у дастатковай меры яркім, але не рэзкім, таму рэкамендуецца выкарыстанне настольных лямпаў з плафонам. Навакольная прастора павінна быць асветлена так, каб вочы не атрымлівалі лішняга напружання пры пераходзе ад паўзмроку да яркага святла. Рэзкі кантраст хутка стамляе, з'яўляюцца пачуццё напружання і рэзі ў вачах. Пры працяглай глядзельнай рабоце ва ўмовах пастаяннага кантрасту асветленасці развіваецца ўстойлівы спазм акамадацыі, які вядзе ў далейшым да фарміравання блізарукасці. Пры добрым зроку цалкам дастаткова святла ад настольнай лямпы ў 60—80 Вт. Размяшчайце яе злева за 50 сантыметраў ад працоўнага сшытка.

***— У апошнія гады з'явіўся дадатковы фактар, які спрыяе пагаршэнню зроку, — мабільныя тэлефоны, камп'ютары і іншыя гаджэты...***

— Работа за камп'ютарам з'яўляецца сур'ёзнай нагрузкай не толькі на органы зроку, але і на ўвесь арганізм у цэлым. Многія дзеці гадзінамі праседжваюць за маніторам, цалкам паглынутыя камп'ютарнымі гульнямі. Асабліва шкодныя разнастайныя «стралялкі» — гульні з частымі зменамі кадраў, мігатлівымі светлавымі і каляровымі эфектамі. Аптымальны час бесперапыннай работы за камп'ютарам не павінен перавышаць 25—30 хвілін для старшакласнікаў і 10 хвілін — для малодшых школьнікаў. Пасля гэтага абавязковы перапынак на 10 хвілін для размінкі і гімнастыкі для вачэй.

Умовы работы за камп'ютарам і пры чытанні вельмі важныя. Аптымальным лічыцца адлегласць паміж вачамі і старонкамі кнігі прыкладна 30—35 см, а да манітора яна павінна быць роўнай даўжыні выцягнутай рукі.

Паклапаціцеся пра наяўнасць дадатковага асвятлення пры рабоце з камп'ютарам ці для прагляду тэлевізара ў цёмны час сутак, але святло не павінна ўтвараць блікаў на маніторы ці экране. Глядзець тэлевізар рэкамендуецца з адлегласці не менш за два метры.

Падчас работы за камп'ютарам давайце адпачынак вачам хаця б па 10—15 хвілін кожную гадзіну. Найбольш простыя практыкаванні для вачэй адбяруць у вас крыху часу, але прынясуць зроку карысці не менш, чым адпачынак у дарагім санаторыі.



***— Ці дапамогуць захаванню зроку фізічныя практыкаванні?***

— У школьным узросце неабходны сістэматычныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі, накіраваныя не толькі на развіццё фізічных якасцяў і забеспячэнне рухальных дзеянняў, але і на развіццё культуры руху, прафілактыку захворванняў. Заняткі фізкультурай і спортам забяспечваюць паляпшэнне дзейнасці ўсіх органаў і сістэм, стымулююць абменныя працэсы ў арганізме, што станоўча ўздзейнічае на зрок.

***— Якія прадукты спрыяюць здароўю вачэй?***

— Меню для вачэй павінна змяшчаць вітаміны D і А, іх недахоп у арганізме прыводзіць да пагаршэння зроку. Вітамін А можна атрымаць з яек, вяршкоў і печані траскі, а вітамінам D насычаны жаўток яек, ялавічная печань і марскі селядзец. Паколькі сінтэз гэтага вітаміну адбываецца ў арганізме чалавека пад уздзеяннем ультрафіялету, не трэба грэбаваць у сонечны дзень прагулкамі на свежым паветры.

***— Якія яшчэ правілы дапамогуць захаваць зрок?***

— Варта не забываць аб асабістай гігіене вачэй. Мала хто з нас можа пахваліцца тым, што жыве ў экалагічна чыстым горадзе. Таму вазьміце за правіла, вяртаючыся кожны раз з вуліцы, прамываць вочы цёплай кіпячонай вадой: яны пакутуюць ад бруду, выхлапных газаў і пылу не менш, чым скура твару.

Раз на два тыдні можна рабіць ванначкі для вачэй са свежазаваранай гарбаты — цудоўнага супрацьзапаленчага сродку. Наліце слабазавараны цёплы напой у посуд, адкрытым вокам дакраніцеся да паверхні вадкасці так, каб у ёй «выкупаўся» вочны яблык, некалькі разоў паміргайце. Паўтарыце працэдуру для другога вока.

Не меншай эфектыўнасцю валодае і водны настой кветак рамонку ці ліпы, іх можаце купіць у любой аптэцы. Вазьміце 1 ч. лыжку рамонку або кветак ліпы, заліце іх шклянкай кіпеню, праз 15 хвілін працадзіце. Настой пакаёвай тэмпературы выкарыстоўвайце для прамывання вачэй. Апроч іншага, ён надае бляск вачам.

Карысна ведаць

# ГРЫБНЫ ЭТЫКЕТ

## Не памыліцца з дарамі лесу

**Баравікі, падбярозавікі, чырвонагаловікі — сапраўдны поспех для грыбніка. Іх збор прыносіць масу станоўчых эмоцый і дапамагае разнастаіць меню. Свежае лясное паветра і ўмераная фізічная актыўнасць — адны плюсы для здароўя аматараў ціхага палявання. Аднак нараўне з карыснымі смакавымі якасцямі грыбы нясуць і вялікую небяспеку для здароўя і жыцця. У Беларусі штогод рэгіструюцца выпадкі атручэння грыбамі, у тым ліку і са смяротным зыходам. Каб не азмрочыць сабе жыццё, трэба прытрымлівацца некаторых правіл. Пра іх нагадала інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.**

• Збірайце толькі добра знаёмыя віды грыбоў. Памятайце правіла: не ведаеш — не бяры!

• Не збірайце старыя, чарвівыя, пагнілыя грыбы.

• Не збірайце грыбы ўздоўж аўтамабільных дарог, у межах горада, паблізу ад прадпрыемстваў.

• Збірайце грыбы ў плеценыя кошыкі — так яны даўжэй застануцца свежымі.

• Грыбы — хуткапсавальны прадукт. Перабраць і падвергнуць кулінарнай апрацоўцы іх неабходна ў дзень збору.

• Не варта захоўваць ці саліць грыбы ў ацынкаваным ці алюмініевым посудзе.

• Перад кулінарнай апрацоўкай старанна перабярыце грыбы, ачысціце іх ад рэштак зямлі, пяску, лісця.

• Не ешце грыбы ў сырым выглядзе.

• Нельга ўжываць умоўна ядомыя грыбы без спецыяльнай апрацоўкі: папярэдняга вымочвання, адварвання з наступным злівам адвару.

• У лесе ўважліва сачыце за дзецьмі, растлумачце, што нельга браць незнаёмыя грыбы ў рукі, у рот.

• Выконвайце правілы кансервавання і прыгатавання грыбных страў.

• Не купляйце ў выпадковых асоб грыбы ў сушаным або кансерваваным выглядзе, прыгатаваныя ў хатніх умовах.

• Грыбы з'яўляюцца прадуктам, які цяжка пераварваецца. Іх не рэкамендуецца ўжываць дзецям, людзям сталага веку, а таксама асобам з захворваннямі страўнікава-кішачнага тракта (гастрыты, халецыстыты, панкрэатыты, гепатыты і інш.), бо прыём грыбоў можа справакаваць абвастрэнне хранічнага захворвання.

Пры з'яўленні першых прыкмет атручэння грыбамі (млоснасць, ваніты, болі ў жываце, расстройства функцыі кішэчніка) варта неадкладна звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

### ЦІ МОЖНА АТРУЦІЦЦА ЯДОМЫМІ ГРЫБАМІ?

Гэта можа адбыцца пры няправільных апрацоўцы ці кансерваванні. Толькі што сабраныя лясныя грыбы пры пакаёвай тэмпературы не варта захоўваць больш



за 2-3 гадзіны. Іх абавязкова варта падвергнуць кулінарнай апрацоўцы ў дзень збору ці не пазней за наступную раніцу. Асноўнымі відамі апрацоўкі грыбоў з'яўляюцца чыстка, мыйка праточнай вадой, варэнне са злівам ад аднаго да трох адвараў, саленне, марынаванне, смажанне і сушка. Сырыя, дрэнна вычышчаныя, недавараныя, недасмажаныя і несоленыя грыбы могуць стаць прычынай атручвання.

Атруціцца можна і старымі ядомымі грыбамі, а таксама дарамі лесу, сабранымі ў месцах забруджвання глебы таксічнымі элементамі. Акрамя таго, грыбы могуць быць крыніцай вельмі цяжкага захворвання — батулізму, узбуджальнік якога ў выглядзе спораў змяшчаецца галоўным чынам у глебе.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец:** ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. Тел. (0154) 65 25 01

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by

| Предмет электронных торгов | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|
| **Здание гостиницы** (здание гостиниц, мотелей), инв. номер 420/С-74634, общей площадью 90,1 кв. м, расположенный по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1В | **13 083,03 с НДС 20 %** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423684007601000002:** предоставлен на праве общей долевой аренды до 23.11.2068 г. (доля 475/3486) для обслуживания торгового центра, ресторана и гостиницы общей площадью 0,3486 га | |
| **Цех подсобных промыслов** (здание неустановленного назначения), инв. номер 420/С-101787, общей площадью 206,7 кв. м, расположенный по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1Г | **34 288,14 с НДС 20 %** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423684007661000217:** предоставлен на праве аренды до 08.11.2071 г. для строительства и обслуживания здания цеха подсобных промыслов общей площадью 0,0252 га | |
| **Блокированный жилой дом** (здание блокированного жилого дома), инв. номер 430/С-57366, общей площадью 122 кв. м, расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, д. Ловцы, 1. Составные части и принадлежности: погреб | **5 669,95 (без НДС)** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 442438520510100001 7:** предоставлен на праве аренды до 31.01.2069 г. для обслуживания блокированного жилого дома общей площадью 0,2499 га | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 08.08.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
Начало торгов: 10.00 **09.10.2024 г.**
Окончание торгов: 11.00 **09.10.2024 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **08.10.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| Контактные данные | Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29)-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by |
|---|---|

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**КУП «Магазин № 3 г. Несвижа»** (УНП 690298378),
объявляет о проведении **11.10.2024 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by.**
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП **bankrot-torg.by.**

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**учреждения «Купальня»** (УНП 691510894),
объявляет о проведении **23.09.2024 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by.**
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки **bankrot-torg.by.**

---

БЕЛАРУСБАНК

## ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):

| № объекта | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (назначение: здание специализированное финансового назначения; наименование: здание отделения банка) с инвентарным номером 200/С-80795, общей площадью: 77,9 кв. м (принадлежности: сарай, уборная, две калитки, ворота, пешеходные дорожки, площадки, проезд, автостоянка, площадка для мусорных контейнеров, канализационная сеть, участок сети наружного освещения, ограждение (200990020102327), водопроводная сеть (200990020102192), участки сети электроснабжения (200990020102194)) | Витебская обл., г.п. Яновичи, ул. Унишевского, 12 | 15 436,80 (пятнадцать тысяч четыреста тридцать шесть рублей 80 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 2 572,80 (две тысячи пятьсот семьдесят два рубля 80 копеек) |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявления на участие принимаются по адресу: **г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00, в пятницу до 15.00 по 15.10.2024.**

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 15.10.2024 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 17.10.2024 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 1 261,20 руб. (в т. ч. НДС 20 %): приточный агрегат tip отд. 200/126 (инв. номер 200990020102193), котел отопительный водогрейный КЧУ в количестве 2 шт. (инв. номера 200990020102195, 200990020102196), счетчик учета электроэнергии трехфазный в количестве 2 шт. (инв. номер М 200990000047541, М 200990000047542), манометр НП в количестве 4 шт. (инв. номера ВН 200990110006056, ВН 200990110006057, ВН 200990110006058, ВН 200990110006059).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем: не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.**

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного торгового унитарного предприятия «ЗападХимТорг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3281-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041523, 2019 г. вып. | 26 628,00 | 2 662,80 | 1 331,40 |
| 2 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3600-4, кузов (рама) № VF18SRPL463766913, 2019 г. вып. | 39 360,00 | 3 936,00 | 1 968,00 |
| 3 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3296-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041533, 2019 г. вып. | 40 920,00 | 4 092,00 | 2 046,00 |

В отношении лота № 1 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 30 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 166 (30300) от 27.08.2024, стр. 14.
В отношении лотов №№ 2, 3 проводятся первые повторные торги. Ранее публикация размещалась в газете «Рэспубліка» от 18.06.2024

**Местонахождение лотов:** г. Минск, ул. Калиновского, 117

В отношении лотов имеется временное ограничение на снятие транспортных средств с учета. Подробнее по тел. +375293650697 (Екатерина)

| Дата и время проведения торгов | **24 сентября 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
|---|---|
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 11 сентября 2024 года до 16.00 20 сентября 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», частное предприятие «ЗападХимТорг», проводимых 24.09.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи.
Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1 – 6 %, по лотам №№ 2, 3 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пять) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семь) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293042560 (Андрей)**. Дополнительная информация по лотам: **+375293042560 (Андрей), +375293082762 (Екатерина)**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| Информация о продавце | **Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 365-06-97 (Екатерина) (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корпус 1, комн. 6, УНП 590828925)** |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. ☎ Тел. 8 (029) 308 28 97 • E-mail: info.torgi@orgtorg.by • Сайт https://orgtorg.by • Telegram https://t.me/orgtorg** |

---

## Информация о проведении 27 сентября 2024 года в 12.00 повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Торговый дом «Восточный»

**Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708179937, общей площадью 2878,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, тр-т Игуменский, 16-388 (наименование и назначение – торговое помещение), и установленные в нём системы и оборудование: система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре с инвентарным номером 2748, система водяного пожаротушения и система автоматизации с инвентарным номером 2749, система охранной сигнализации с инвентарным номером 2751, система контроля доступа с инвентарным номером 2753, система холодоснабжения с инвентарным номером 2756

| **Начальная цена** – 8 179 347,14 бел. руб. с учетом НДС | **Размер задатка** – 817 934,71 бел. руб. |
|---|---|

**Продавец имущества –** РУП «Торговый дом «Восточный», 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14А, тел. +375 (17) 275 75 23.
**Организатор торгов –** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 365 48 36

**Срок и место приема заявлений: по 25.09.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)

**Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36.

УНП 190398583

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# МАСТАЦКІМІ СЦЕЖКАМІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

**Старыя паштоўкі, сабраныя Уладзімірам Ліхадзедавым, найперш з'яўляюцца ілюстрацыяй да падзей канца XIX — першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. У такім разе — хто, якія яркія асобы вандравалі па Беларусі ў той час? Хто сваімі лёсамі злучыўся з нашым краем менавіта ў той перыяд?.. Няхай сабе і на кароткі... Давайце паспрабуем пазнаёміцца з пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі, акцёрамі Расіі і іншых постсавецкіх прастораў, якія адкрывалі Беларусь сто і болей гадоў назад. Адкрывалі Беларусь увогуле, а болей адрасна знаёміліся з нашымі прашчурамі, рознымі адрасамі хаця б, напрыклад, на Віцебшчыне...**


Віцебск. Погляд на горад. Пачатак XX стагоддзя.

У сядзібе Асінаўка Аршанскага павета нарадзіўся рускі педагог, пісьменнік, географ Дзмітрый Дзмітрыевіч Сямёнаў (у 1834 ці 1835—1902). У 1852 годзе закончыў Віцебскую гімназію. У 1859 годзе — настаўніцкія курсы Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Вытрымаў экзамен на званне настаўніка геаграфіі. У 1860—1862 гг. быў настаўнікам пачатковых класаў і геаграфіі славутага Смольнага інстытута. 14 гадоў жыцця Дзмітрый Дзмітрыевіч аддаў настаўніцтву на Каўказе. З 1878 года быў дырэктарам Закаўказскай (Гарыйскай) настаўніцкай семінарыі. У 1888—1891 гг. рэдактар часопіса «Детское чтение». Асноўная праца Дзмітрыя Сямёнава — геаграфічная хрэстаматыя «Айчыназнаўства», якая выйшла ў шасці тамах. Яна і цяпер падаецца крыніцай цікавых звестак.

Родам з Віцебскага павета — савецкі эколаг і пісьменнік Рыгор Логінавіч Шакулаў (1910—1987), які з 1953 да 1973 года выдаў 12 кніг казак для дзяцей. У 1931 годзе Шакулаў закончыў Віцебскі педагагічны тэхнікум. Першыя мастацкія творы напісаў на беларускай мове. Старшыня секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт, празаік, перакладчык, дзіцячы пісьменнік Мікалай Бутэнка так адгукаўся аб творчасці нашага земляка: «Казкі Шакулава вучаць любіць прыроду, але яшчэ болей яны вучаць любіць бліжняга свайго». Дарэчы, 100-годдзе з дня нараджэння Р. Шакулава ў 2010 годзе было ўрачыста адзначана ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы. Агульны тыраж выдадзеных кніг Рыгора Логінавіча склаў болей за 400 тысяч экзэмпляраў.

У Астраханску, Краснадары і Магнітагорску ў педагагічных інстытутах працаваў мовазнаўца, славіст, педагог Анатоль Васільевіч Багдановіч (1888—1969), які нарадзіўся ў Дрысенскім павеце. Дрыса — з 1962 года Верхнядзвінск. У 1909 годзе Анатоль закончыў Віцебскую духоўную семінарыю.

На хутары Судзіловічы Лепельскага павета (цяпер вёска Будзькаўшчына Полацкага раёна) нарадзіўся літаратуразнаўца, паэт, фалькларыст Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла (1859—1934), прафесар Імператарскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу. Менавіта ён з'яўляўся ініцыятарам стварэння выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша ваконца». Гэта якраз ён спрыяў развіццю творчай актыўнасці Янкі Купалы. Маштаб зробленага Эпімах-Шыпілам для беларускай культуры варты самага шырокага ўшанавання. Даўно наспела патрэба выдаць і Поўны збор твораў Браніслава Эпімах-Шыпілы. Полацк — радзіма савецкага тэатразнаўцы і літаратуразнаўцы Соф'і Маркаўны Нельс (1899—1978). Адна з найболей вядомых яе кніг — грунтоўная манаграфія «Шэкспір на савецкай сцэне».

З вёскі Засквaркі Лепельскага павета — савецкі археолаг і мастацтвазнаўца Сяргей Мікалаевіч Юрэнеў (1896—1973), чый жыццёвы шлях завяршыўся ў Бухары (Узбекістан). Адна з вуліц Бухары з 1995 года носіць імя нашага суайчынніка Сяргея Юрэнева. У прыватным архіве археолага — лісты ад Віктара Някрасава, Льва Гумілёва, Эрнста Неізвестнага, Марыэты Шагінян, Сяргея Барадзіна... Дарэчы, Сяргей Мікалаевіч — дзядзька вядомага савецкага і расійскага кінакрытыка, кіназнаўца Расціслава Мікалаевіча Юрэнева (1912—2002; нарадзіўся ў Віцебску). Лепель — радзіма савецкага літаратуразнаўца, пушкініста Барыса Саламонавіча Мейлаха (1909—1987), які доўгі час працаваў у Пушкінскім доме, удзельнічаў у рабоце Пушкінскай камісіі АН СССР. Барыс Мейлах — аўтар кніг «Пушкін і рускі рамантызм», «А. С. Пушкін. Нарыс жыцця і творчасці», «Пушкін і яго эпоха», «А. С. Пушкін: семінарый», «Жыццё Аляксандра Пушкіна», «Талісман: кніга пра Пушкіна», «Дзекабрысты і Пушкін: старонкі героіка-трагічнай гісторыі»...

У Максімаўцы Полацкага павета нарадзіўся савецкі мастак Арсеній Нічыпаравіч Сямёнаў (1911—1992). Дзяцінства правёў ужо на Магілёўшчыне, у Быхаве. З 1927 года ў Ленінградзе. Вучыўся ў вядомага мастака і педагога Альфрэда Эберлінга. Мастак Сямёнаў — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прайшоў шлях ад радавога байца да камандзіра танкавага батальёна. Пяць разоў быў паранены, узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў. На Лёзненшчыне нарадзіўся другі ленінградскі мастак — Якаў Андрэевіч Голубеў (1913—1973). З 1926 года жыў у Ленінградзе. У 1934 годзе паступіў у падрыхтоўчыя класы інстытута жывапісу, скульптуры і архітэктуры Акадэміі мастацтваў. Вось назвы толькі некаторых прац нашага земляка: «Спакойны дзень», «Пачатак сакавіка», «Блакітная вада», «Вясенняя трава», «Веснічкі»... Творы Якава Голубева захоўваюцца ў многіх музеях і прыватных зборах Расіі, Японіі, Італіі, Германіі, Францыі, Літвы...

Лугінічы Віцебскай губерні — радзіма паэта, этнографа, перакладчыка Тадэвуша Лады Заблоцкага (1811—1847), чый жыццёвы шлях завяршыўся на Каўказе, у Эрыванскай губерні (Эрыван — зразумела, Ерэван). Тадэвуш вучыўся ў Віцебскай гімназіі. Затым — у Імператарскім Маскоўскім універсітэце. У час вучобы пазнаёміўся з Вісарыёнам Бялінскім. Летам 1833 года быў арыштаваны за распаўсюджванне песні, скіраванай супраць цара. Быў высланы на Каўказ і прызначаны радавым у батальён сапёраў. Удзельнічаў у баях з горцамі. З 1839 года больш часу знаходзіўся ў Тыфлісе. Пазней Заблоцкага вызвалілі ад службы ў войску. На Каўказе паэт пазнаёміўся з Якавам Палонскім, пасябраваў з грузінскім паэтам Мікалаем Бараташвілі, дочкамі Аляксандра Чаўчавадзэ — Нінай Грыбаедавай і Кацярынай Дадзіяні, азербайджанскім паэтам і гісторыкам Абас Кулі-ханам Бакіханавым, які, між іншым, падарожнічаў у 1834 годзе па Расіі, Латвіі, Літве, Польшчы...


Орша. Погляд на Пецярбургскую вуліцу. Пачатак XX стагоддзя.

У Гарадку нарадзіўся савецкі пісьменнік, драматург, літаратурны крытык Барыс Міхайлавіч Аршанскі (1884—1945). Яго першыя кнігі пабачылі свет яшчэ ў Вільні. Пахаваны Б. Аршанскі ў Маскве на Новадзявочых могілках. Браслаўшчына — радзіма рускай паэтэсы Ірыны Арсеньеўны Ягміной. Жыла ў Вільнюсе. З 1840 года яна ў эміграцыі ў Вене, затым — у ЗША. Надрукавала ў эміграцыі некалькі зборнікаў вершаў на рускай мове. Віцебская губерня — радзіма генерала Расійскай імперыі і празаіка, мемуарыста, батаніка Ільі Цімафеевіча Радажыцкага (1788—1861), які за адвагу ў баі каля мястэчка Астраўно, непадалёку ад Віцебска, 13 ліпеня 1812 года ўзнагароджаны ордэнам Анны 4-й ступені. Адна з кніг І. Радажыцкага — «Паходныя запіскі артылерыста з 1812 да 1816 гг.», дзе, пэўна, ёсць і беларускія старонкі вайсковай, гістарычнай памяці. Між іншым, Радажыцкі — прататып артылерыйскага капітана Тушына ў рамане Льва Талстога «Вайна і мір». Пры напісанні рамана класік рускай і сусветнай літаратуры карыстаўся запіскамі нашага земляка... Колькі сувязяў нашых прашчураў, якія жылі ў даўно мінулыя, страчаныя часіны, з Расіяй, з усім светам!..



Лепель. Пошта. Пачатак XX стагоддзя.


Полацк. Погляд на горад Мікалаеўскі сабор. Пачатак XX стагоддзя.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**
**Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», лаўрэата Прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне культуры і мастацтва Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**


Гарадок. Мясцовыя жыхары. Пачатак XX стагоддзя.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Коралл» г. Гомель (продавец) извещает о проведении 14 октября 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2-9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-61835**, общей площадью **142,7 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад цемента**. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002006010** общей площадью **4,9886 га (право аренды).** **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственных и административно-бытовых зданий и сооружений | **43 000,00** | 4 300,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Коралл» г. Гомель, 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского, 7.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. **8 (044) 588-63-34 Коваленко Галина Николаевна.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (Открытое акционерное общество «Коралл» г. Гомель):** р/с BY52 BPSB 3012 1118 8901 9933 0000, БИК BPSBBY2X, ОАО «Сбер Банк» г. Минск, УНП 400051785, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 сентября 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 октября 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену.

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам договора купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

